ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА



**Злавіць хвалю**



**Якое яно, пакаленне візуалаў?**



**Праз фокусы дакрануцца да цуду**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Аляксандр КАНЮК, генеральны пракурор:**

*«Мы канстатуем зніжэнне злачыннасці. Важна, што знізілася перш за ўсё колькасць цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынстваў, забойстваў, замахаў на забойства. Адзначаецца зніжэнне рэцыдыўнай, групавой злачыннасці, а таксама злачынстваў, здзейсненых у стане алкагольнага ап'янення і ў грамадскіх месцах. Знізілася колькасць крадзяжоў, рабаванняў, разбояў, угонаў і вымагальніцтваў. Падкрэслю, што павелічэнне колькасці выяўленых карупцыйных правапарушэнняў і злачынстваў звязана перш за ўсё з больш актыўнымі дзеяннямі па іх выяўленні праваахоўнымі органамі: пракуратурай, КДБ, МУС, Дэпартаментам фінансавых расследаванняў».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 18.01.2018 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9963 | ▲ |
| Еўра | 2,4410 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0352 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0695 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

18012

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

18 СТУДЗЕНЯ 2018 г. ЧАЦВЕР № 12 (28628)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# ПЕРШАЯ ЛАСТАЎКА ЗІМЫ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Вучаніцы сярэдняй школы № 55 Ленінскага раёна сталіцы Альвіна ДАМАРАТ *(на першым плане)*, Магдаліна ГАЛАЎКО і Надзея АНДРЫЯНАВА радуюцца сапраўднаму снегу і выпрабоўваюць горку на школьным стадыёне.**

ГЛУША Адамовіча

## ДОМ З НЯПРОСТЫМ ЛЁСАМ

**Назіральны савет у Бабруйску вырашаў далейшы лёс стварэння музея Алеся Адамовіча ў пасёлку Глуша**



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Музей можа пачацца з віртуальнай старонкі.

**Вось ужо трэці год «Звязда» звяртаецца да тэмы стварэння музея Алеся Адамовіча ў пасёлку Глуша Бабруйскага раёна (першы артыкул, прысвечаны гэтай тэме, выйшаў у кастрычніку 2015 года). За гэты час быў адкрыты разліковы рахунак пры аддзеле ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Бабруйскага райвыканкама (публікацыя ад 4.03.2016 года), а некалькі месяцаў таму пачала працаваць назіральная рада (артыкул ад 2.09.2017 года). Днямі адбылося другое пасяджэнне гэтай рады, дзе абмяркоўваліся пытанні рэалізацыі праекта. Сітуацыя, мякка кажучы, складаная.**

СТАР. 13

■ Разумныя грошы

## «ПЛАСТЫК» З БОНУСАМІ

**Пазыка з дастаўкай на дом і аддзяленні самаабслугоўвання, крэдыты «Іпатэка з намі» і розныя кабрэндынгавыя карткі...**

**Многія банкі пачалі 2018 год з высокатэхналагічных навін, задаючы тым самым трэнд на будучыню. Прадстаўляем вам агляд самых цікавых з іх.**

### Банк без касіраў

Пазычыць грошы цяпер можна праз інтэрнэт — гэта ўжо рэальнасць. Такую магчымасць рэалізаваў адзін айчынны банк. Усе дзеянні звodзяцца да некалькіх крокаў у інтэрнэт-банкінгу. Пасля таго як заяўка будзе адобрана, грошы можна атрымаць на свой рахунак або замовіць з дастаўкай на дом. Галоўнае, каб вы былі вядомы банку і мелі станоўчую крэдытную гісторыю.

Адразу некалькі высокатэхналагічных навінак прэзентаваў другі прыватны банк. Некаторыя яго аддзяленні абзавяліся пунктамі самаабслугоўвання. Там можна самому падключыць інтэрнэт-банкінг і ўжо потым скарыстацца нейкімі паслугамі (падаць заяўку на крэдыт, адкрыць уклад і гэтак далей). Можна лічыць, чарговы крок да банка без касіраў. Акрамя таго, банк пачаў кансультаваць кліентаў у WhatsApp, Viber і Skype.

### Карысна для вашага кашалька

Нашы банкі ўжо добра навучыліся выкарыстоўваць любоў да лёгкіх грошай. На звычайныя прадукты «наважваюць» бонусы і тым самым прыцягваюць кліентаў. Нам такая бонусная «прынада» больш вядомая, як кабрэндынгавыя пластыкавыя карткі. Гэта выпуск сумесных пластыкавых картак паміж банкамі і якімі-небудзь арганізацыямі.

Прапановы ад банкаў па кабрэндынгавым пластыку разнастайныя: ад ужо вельмі раскручанай «Моцнай карткі» і да праекта з вядомай заправачнай сеткай. Звернем увагу, што гэтыя карткі з'яўляюцца не проста бонуснымі, а паўнавартаснымі дэбетовымі картамі. Вы можаце здымаць грашовыя сродкі, расплачвацца за звычайныя пакупкі і адначасова атрымліваць за гэта зніжкі (бонусы) ад банка або арганізацыі-партнёра. А часам кабрэнды могуць быць і крэдытнымі.

СТАР. 4

■ Ва ўрадзе

# ВУП-2017 ВЫШЭЙШЫ ЗА ПРАГНОЗЫ

## У прыярытэце бізнес-клімат і новыя працоўныя месцы

**Тэмп росту беларускай эканомікі за мінулы год абышоў чаканні статыстыкаў. Як адзначыў прэм'ер-міністр Андрэй КАБЯКОЎ, ВУП краіны ў 2017 годзе склаў 102,4 % пры прагнозным паказчыку ў 101,7 %.**

Падчас пасяджэння Прэзідыума Савета Міністраў, дзе разглядаліся пытанні аб мерах па рэалізацыі задач сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны і чаканых выніках работы эканомікі ў студзені і І квартале сёлета, прэм'ер закрануў пытанні ўвязкі заробкаў з прадукцыйнасцю працы ў пазабюджэтным сектары, а таксама больш шчыльнай працы дзяржавы з прыватнікамі.

Андрэй Кабякоў паведаміў, што апярэджанне прагнозных паказчыкаў на 0,7 % забяспечыла выхад на параметры росту эканомікі і кампенсавала адставанне 2016 года. «Кіраўніком дзяржавы зацверджаны прагнозныя параметры на 2018 год, у іх развіццё прыняты адпаведныя пастановы ўрада, дзе сфарміравана матрыца ключавых паказчыкаў усёй вертыкалі», — дадаў прэм'ер-міністр. Паводле яго слоў, галоўнымі задачамі збалансаванага росту эканомікі сёлета застаюцца: нарошчванне і дыверсіфікацыя экспарту, прыцягненне інвестыцый, стварэнне новых працоўных месцаў у першую чаргу ў сектары малой і сярэдняй дзелавой ініцыятывы. Для гэтага неабходна разгарнуць поўнамаштабную работу па рэалізацыі прынятых кіраўніком дзяржавы рашэнняў па лібералізацыі ўмоў вядзення бізнесу.

«Каб максімальна знізіць залежнасць эканомікі ад знешніх фактараў, павысіць прадукцыйнасць працы і канкурэнтаздольнасць вытворчасці, нам жыццёва неабходна мінімізаваць свае выдаткі. Для росту эканомікі на здаровай аснове трэба ствараць працоўныя месцы, развіваць малы і сярэдні бізнес», — сказаў Андрэй Кабякоў. Прэм'ер-міністр падкрэсліў, што павышэнне прадукцыйнасці працы і ўкараненне новых тэхналогій, як правіла, суправаджаецца вызваленнем часткі работнікаў. Стварэнне новых працоўных месцаў у сектары малога і сярэдняга бізнесу дазваляе пераразмеркаваць гэтых людзей у іншыя сферы дзейнасці без сацыяльных узрушэнняў.




Таксама ён звярнуў увагу прысутных на тое, што рост заработнай платы ў пазабюджэтным сектары павінен быць увязаны з прадукцыйнасцю працы.

«Арыенцір па ўзроўні сярэдняга заробку вызначаны на нарадзе ў кіраўніка дзяржавы 21 лістапада 2017 года, усе неабходныя даручэнні дадзены. Грошы павінны быць зароблены», — падкрэсліў Андрэй Кабякоў. Кіраўнік урада зрабіў акцэнт на неабходнасці абавязковага выканання такіх паказчыкаў, як зніжэнне ўзроўню выдаткаў і працаўладкаванне на наваствораныя працоўныя месцы.

Такім чынам Андрэй Кабякоў даў зразумець прадстаўнікам дзяржорганаў, што неабходна максімальна даходліва давесці да людзей інфармацыю пра новыя магчымасці для вядзення бізнесу, якія адкрываюцца пасля прыняцця пакета дакументаў па развіцці прадпрымальніцтва. «Мінэканомікі сумесна з аблвыканкамамі пры ўдзеле МПЗ, Міністэрству антыманапольнага рэгулявання і гандлю, Міністэрству аховы здароўя і іншым зацікаўленым неабходна ўжо ў найбліжэйшы час арганізаваць у кожным рэгіёне выязныя сустрэчы, семінары, растлумачыць даступным чынам на канкрэтных прыкладах новыя правілы вядзення бізнесу і як імі карыстацца», — падкрэсліў Андрэй Кабякоў. Пры гэтым ён адзначыў, што рабіць гэта неабходна разам з мясцовымі саветамі па развіцці прадпрымальніцтва.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

■ Правы

# Даўжнікі зноў у інтэрнэце

## Хто колькі вінен і калі запазычанасць можна не вяртаць

**Рэестр юрыдычных і фізічных асоб, якія маюць запазычанасці па выканаўчых дакументах, аднавіў работу на сайце Міністэрства юстыцыі Беларусі. На інфармацыйным рэсурсе змешчаны ўсе звесткі пачынаючы з 15 жніўня 2017 года.**

Цяпер тут можна даведацца пра запазычанасці грамадзян, юрыдычных асоб і іншых суб'ектаў, з якіх органы прымусовага выканання спаганяюць даўгі. Каб знайсці асобу ці фірму, якія вінны грошы, ці ўпэўніцца, што іх няма ў рэестры, у спецыяльных палях на сайце http://minjust.gov.by/clientvip трэба ўвесці прозвішча, імя, імя па бацьку і ідэнтыфікацыйны нумар пашпарта чалавека або рэгістрацыйны нумар і назву кампаніі.

У «Рэестры запазычанасцяў па выканаўчых дакументах» відаць звесткі аб дакументах, якія знаходзяцца на выкананні ў органах прымусовага выканання больш за 30 дзён. Тут таксама можна даведацца пра прычыны вяртання выканаўчага дакумента спагнанніку. Напрыклад таму, што юрыдычная асоба, з якой спаганяюць грошы, выключана з Адзінага дзяржаўнага рэгістра юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў. Іншыя варыянты — у даўжніка няма маёмасці, якую можна спагнаць у залік вяртання запазычанасці, або неплацельшчык аб'яўлены банкрутам, ліквідаваны ці яму дадзена судом адтэрміноўка або растэрміноўка выканання.

Выканаўчае вядзенне можна спыніць, напрыклад, калі даўжнік і спагнаннік заключаюць міравое пагадненне або даўжнік памёр. Даўжнік, які з'яўляецца абавязанай асобай і вінен грошы за ўтрыманне дзяцей на дзяржаўным забеспячэнні, таксама вызваляецца ад даўгоў, калі яму вяртаюць малых, дадалі ў Міністэрстве юстыцыі.

Разам з тым інфармацыя, змешчаная ў рэестры, даведачная. Каб удакладніць яе, неабходна звяртацца ў органы прымусовага выканання, раяць у Мінюсце. Пасля пісьмовай заявы грамадзяніна ці юрыдычнай асобы і аплаты дзяржаўнай пошліны (тры базавыя велічыні) можна атрымаць поўную інфармацыю пра наяўнасць выканаўчых вядзенняў у дачыненні да даўжніка і абмежаванні, якія прыменены да яго і яго маёмасці.

«Рэестр запазычанасцяў па выканаўчых дакументах» дазволіць грамадзянам і суб'ектам гаспадарання атрымліваць актуальную інфармацыю пра свае даўгі і своечасова пагашаць іх, прадухіляючы тым самым негатыўныя наступствы прымусовага выканання, упэўнены ў Міністэрстве юстыцыі.

**Ірына СІДАРОК.** *sidarok@zviazda.by*

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### УРАЧ БЕЛАГА ДОМА РАСКАЗАЎ АБ ЗДАРОЎІ ТРАМПА

**Па словах галоўнага ўрача Белага дома Роні Джэксана, 45-ы прэзідэнт ЗША мог бы дажыць да 200 гадоў, калі б прытрымліваўся правільнага ладу жыцця ў мінулым.**



Адказваючы на пытанне журналістаў, як 71-гадовы аматар гамбургераў можа валодаць цудоўным здароўем, Джэксан заявіў, што ў Трампа «падараваныя Богам цудоўныя гены». Адзіныя лекі, якія рэгулярна прымае цяперашні кіраўнік амерыканскай дзяржавы, — прэпарат для паніжэння ўзроўню халестэрыну ў крыві і сродак ад выпадзення валасоў.

Урач расказаў, што Трамп клапоціцца пра сябе, не курыць, не ўжывае спіртнога і хоча пазбавіцца на 5—7 кілаграмаў.

Таксама Джэксан расказаў, што па просьбе Трампа правёў серыю тэстаў для вызначэння магчымых парушэнняў функцый галаўнога мозга. «Ён прайшоў ускладнены тэст і набраў 30 балаў з 30. Няма нічога, што б паказвала на кагнітыўныя праблемы», — супакоіў прысутных медык.

Стала вядома, што 14 студзеня 90 медыкаў напісалі адкрыты ліст Джэксану, запатрабаваўшы ад яго правесці не толькі фізічны агляд прэзідэнта ЗША Дональда Трампа, але і пераканацца ў яго душэўным здароўі.

### БІТКОЙН ЗА СУТКІ АБВАЛІЎСЯ НА ЧВЭРЦЬ

**Курс біткойна за мінулыя суткі ўпаў на 25,1 працэнта. Пра гэта сведчаць даныя партала Coinmarketcap.**

Па стане на 17 студзеня за «манету» прапануюць 10 913 долараў ЗША, на ніжнім піку таргоў адзінка крыптавалюты прадавалася за 10 194 долары.

Іншыя крыптавалюты таксама дэманструюць сур'ёзнае падзенне: ад 2,85 да 44,49 працэнта. Ноччу 16 студзеня біткойны прадаваліся яшчэ на ўзроўні 13—13,5 тысячы долараў. 16 студзеня кіраўнік Еўрапейскага ўпраўлення па наглядзе за рынкам каштоўных папер Стывен Мейджар заявіў агенцтву Bloomberg, што інвестары павінны быць гатовыя страціць усе грошы, укладзеныя ў біткойны. На яго думку, экстрэмальная валацільнасць біткойна робіць яго выкарыстанне ў якасці валюты бессэнсоўным.

### ДЗЯРЖАВУ МАКЕДОНІЯ МОГУЦЬ ПЕРАЙМЕНАВАЦЬ З-ЗА ПРЭТЭНЗІЙ ГРЭЦЫІ

**Грэцыя просіць змяніць назву з-за непаразуменняў, якія ўзнікаюць з-за так званай «Грэчаскай Македоніі» — вобласці, якая прымыкае да дзяржавы Македонія. Спрэчка доўжыцца з 1991 года, з моманту выхаду Македоніі са складу Югаславіі, перадаюць навінавыя агенцтвы.**

Грэчаскія ўлады не задавальняе ў тым ліку і назва, з якой у 1993 годзе краіна ўступіла ў ААН, — Былая Югаслаўская Рэспубліка Македонія. На сумесным пасяджэнні пры пасярэдніцтве ААН будзе прапанавана некалькі назваў, якія ўжо абмяркоўваліся раней.

Вядома, што Македонія адхіліла прапанаваную Грэцыяй назву «Вардары». Хутчэй за ўсё, будзе прынята назва «Новая Македонія» або аналагічная.

«Няправільная» назва перашкаджае ўступленню Македоніі ў ЕС і НАТА.

Афіцыйны Скоп'е разлічвае на разгляд пытання аб уступленні ў абодва саюзы летам 2018 года. Улічваючы, што Грэцыя ўступіла ў ЕС і НАТА раней, на саступкі павінна ісці менавіта Македонія.

■ Адукацыя

# ПРЭСТЫЖНАСЦЬ І ПРЫВАБНАСЦЬ

## Як у галоўнай ВНУ краіны будуць змагацца за якасць ведаў?

**Пасады прарэктара па вучэбнай рабоце і адукацыйных інавацыях і прарэктара па вучэбнай рабоце і інтэрнацыяналізацыі адукацыі ўведзены ў БДУ. Пра гэта паведаміла прэс-служба ўніверсітэта.**

Пытанні, якія датычацца функцыянальных абавязкаў прарэктараў і аплаты працы кіраўнікоў структурных падраздзяленняў комплексу БДУ, сталі прадметам абмеркавання на пашыраным пасяджэнні рэктарата. Нагадаем, што крыху больш як тры месяцы таму ў Беларускім дзяржаўным універсітэце адбылася змена кіраўніка, таму ўсе чакалі пэўных рэформаў.

Уважлівы аналіз абавязкаў прарэктараў, дэканаў і галоўнага ўпраўлення вучэбна-метадычнай работы выявіў дубляванне функцый кіраўнікоў. «Гэта памнажае бюракратызм у кіраўніцкім працэсе і зводзіць ролю прарэктараў на тэхнічны ўзровень, — падкрэсліў у сваім выступленні **рэктар БДУ Андрэй КАРОЛЬ**. — Для ўстойлівага развіцця неабходна ўжо запускаць магутную «турбіну», якая прывяла б у рух увесь універсітэт». Для таго каб пазбегнуць падобнага дублявання, функцыянал прарэктараў па вучэбных пытаннях быў адкарэктаваны, пераарыентаваны на актуальныя кірункі дзейнасці БДУ, і былі ўведзены новыя пасады.



Фота Надзеі БУЖАН.

З прычыны перагляду функцыяналу прарэктараў павінен змяніцца і функцыянал дэканаў. У прыватнасці, павысіцца іх роля ў якасці кіраўнікоў. У найбліжэйшы час давядзецца сканцэнтравацца на наступных актуальных для ўніверсітэта пытаннях: праектаванні і рэалізацыі адукацыйных працэсаў на першай і другой ступенях вышэйшай адукацыі, удасканаленні стандартаў адукацыйных праграм, укараненні інавацыйных методык навучання, інтэрнацыяналізацыі адукацыі, экспарце адукацыйных паслуг і рабоце з заказчыкамі. Актуальнасць гэтых пытанняў пацвярджаецца некаторымі звесткамі і фактамі, якія агучыў Андрэй Кароль, у тым ліку і даволі істотнымі лічбамі па колькасці адлічаных студэнтаў. Адну з прычын гэтага рэктар бачыць у фармалізаваным падыходзе выкладчыкаў да навучання. «Пад прэстыжнасцю любога ўніверсітэта трэба разумець яго прывабнасць для студэнта. Гэта тое, наколькі мы забяспечваем маладым людзям магчымасць выявіць, раскрыць і рэалізаваць свой патэнцыял, — падкрэсліў Андрэй Кароль. — А трансляцыяй розным студэнтам аднолькавай, «правільнай» і «гатовай» інфармацыі гэтага дасягнуць нельга. Ці навучаем мы іх ствараць закончаны адукацыйны прадукт, залучаючы ў даследчую і творчую дзейнасць? Адказы звязаны перш за ўсё са змяненнем метадалогіі, зместу навучання на ўзроўні стандартаў і вучэбных праграм, крытэрыяў ацэньвання, выбарам прадукцыйных формаў і метадаў навучання. І тут асаблівую ролю павінен адыграць Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, які ўваходзіць у склад БДУ».

Адкрытым таксама застаецца пытанне экспарту адукацыйных паслуг. У 2017 годзе план па экспарце быў выкананы толькі на 82 %. «Гэты інтэгральны паказчык эфектыўнасці работы ВНУ прымушае задумацца. Таму ракурс на інтэрнацыяналізацыю абраны невыпадкова», — адзначыў рэктар.

Таксама на пасяджэнні рэктарата абмяркоўвалася схема работы ўніверсітэта з заказчыкамі кадраў. «Мы бачым, што гэты працэс пакуль недасканалы. Неабходна выбудоўваць бесперапынны ланцужок: ад замовы спецыяліста арганізацыямі да яго працаўладкавання. Сёння ён перарываецца, і часта таму, што кафедры і факультэты не ўдзяляюць належнай увагі рабоце з заказчыкамі і пытанням размеркавання», — падзяліўся сваім бачаннем сітуацыі Андрэй Кароль. Кіраўніцтва ВНУ мае намер узмацніць работу па ўзаемадзеянні з заказчыкамі кадраў, што адаб'ецца і на магчымасцях фінансавання ўніверсітэта.

На рэктарацe таксама падкрэслівалася актуальнасць прафарыентацыйнай работы ва ўмовах павышанай канкурэнцыі за абітурыента. Яна патрабуе змяненняў у падыходах, кансалідацыі намаганняў факультэтаў, прыёмнай камісіі і ўдасканалення напрамкаў ва ўніверсітэцкім сегменце.

Былі агучаны на рэктарацe і новыя прынцыпы налічэння заработнай платы. Рэктар вылучыў асноўны тэзіс у рэгуляванні гэтай сістэмы: «Не атрымліваць грошы, а зарабляць іх. Неабходна ўзмацніць пазабюджэтную дзейнасць падраздзяленняў».

**Заробак дэканаў факультэтаў і дырэктараў інстытутаў цяпер будзе залежаць у тым ліку ад колькасці студэнтаў, колькасці адукацыйных праграм на першай і другой ступенях, і асабліва, ад колькасці праграм на англійскай мове, замежных навучэнцаў і экспарту паслуг.**

Устаноўлены гранічныя і максімальныя ўзроўні аплаты адміністрацыйнай работы кіраўнікоў. Дадатковa магчыма выкананне імі работ па сумяшчальніцтве (ППС або навуковага суправаджэння) да 0,5 стаўкі. І упершыню са студзеня 2018 года кіраўнік зможа зарабіць да 10 % сродкаў ад фонду аплаты працы, атрыманых у выніку дадатковай пазабюджэтнай дзейнасці падраздзялення.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■ Працяг анталогіі дружбы

# Кніжная серыя «Адрасы Беларусі ў свеце» займела працяг




**Толькі што Выдавецкі дом «Звязда» падараваў чытачу трэцюю кнігу ў згаданым творчым праекце: «Светлымі дарогамі братэрства». Пад адной вокладкай — расказ пра беларуска-ўкраінскае яднанне ў розных яго праявах, пра тое, дзе працавалі і жылі ўраджэнцы Беларусі ва Украіне, якую ўвагу праяўляюць украінцы да беларускай культуры, да самой Беларусі. Аўтары не толькі выкарыстоўваюць раней вядомыя факты, але і сустракаюцца са многімі прыязнымі да Беларусі людзьмі. Пра гэта сведчаць змешчаныя ў кнізе гутаркі, дыялогі з украінскімі пісьменнікамі розных пакаленняў — Яраслаўай Паўлычкай, Аляксеем Кананенкам, Ігарам Січавікам, Галінай Тарасюк, Віктарам Баранавым...**

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь вядомы літаратуразнаўца, гістарычны празаік Алесь Марціновіч прапануе ўвазе чытачоў нарысы пра беларусаў, ураджэнцаў Беларусі Міхаіла Слёзку, Мітрафана Доўнара-Запольскага, Сяргея Палуяна, Браніслава Залескага, Іосіфа Гузікава, Еву Фялінскую, Іосіфа Сакалоўскага, Мендэле Мойхера-Сфорына, чые жыццёвыя, навуковыя, творчыя лёсы спраўдзіліся ў Кіеве, Адэсе, Валыні, іншых гарадах, мясцінах Украіны.

Асобна ў кнізе раскрываецца тэма беларускіх літаратурных адрасоў у Кіеве, Харкаве, Адэсе, Львове. Добрым упрыгажэннем сапраўднай анталогіі дружбы Беларусі і Украіны з'яўляецца публікацыя вершаў украінскіх паэтаў пра Беларусь: пра іх змест гавораць самі назвы — «Яблыкі Купалы», «Снягі Беларусі» Рамана Лубкіўскага, «Чаканне ў Зэльве» Аксаны Сенатовіч, «Пачатак Якуба Коласа» Уладзіміра Лучука. Перакладчыкамі шчырага песеннага ліставання ўкраінскіх паэтаў з беларускай старонкай выступаюць Васіль Зуёнак, Янка Сіпакоў, Уладзімір Караткевіч, Вячаслаў Рагойша, Сяргей Панізнік.

З прадмовай да кнігі «Светлымі дарогамі братэрства: знаёмствы, адкрыцці, дыялогі» выступае вядомы расійскі і беларускі пісьменнік, намеснік старшыні ФНКА «Беларусы Расіі» Валерый Казакоў. Ён жа з'яўляецца і старшынёй рэдакцыйнага савета серыі «Адрасы Беларусі ў свеце».

**Сяргей ШЫЧКО.** *shychko@zviazda.by*

■ Карысныя парады

# Лекавацца душой і целам, але думаць галавой

## Рэкамендацыі ратавальнікаў пры акунанні ў палонку ў свята Вадохрышча

**19 студзеня ў краіне адзначаецца праваслаўнае свята Вадохрышча. Многія ўжо цяпер рыхтуюцца да акунання ў палонку.**

Ратавальнікі заклікаюць рабіць гэта ў спецыяльна арганізаваных месцах. Работнікі МНС нагадваюць: каб не ставіць сваё жыццё пад пагрозу, ні ў якім разе нельга купацца ў стане алкагольнага ап'янення, ныраць і плаваць пад вадой, падаваць крыкі лжывай трывогі, збірацца групамі на лёдзе каля краю палонкі, заходзіць за агароджы. Асаблівую ўвагу спецыялісты звяртаюць на тое, што купанне дзяцей дапускаецца толькі з бацькамі ці дарослымі сваякамі. Дзеці заўсёды павінны быць на адлегласці выцягнутай рукі.

### Рэкамендацыі па купанні ў палонцы:



1. Акунацца (купацца) трэба ў спецыяльна абсталяваных палонках каля берага, пажадана паблізу выратавальных станцый, пад наглядам ратавальнікаў.

2. Перад купаннем у палонцы неабходна разагрэць цела, зрабіўшы размінку, прабежку.

3. Да палонкі неабходна падыходзіць у зручным, не слізкім абутку, які лёгка здымаецца, каб прадухіліць страту адчувальнасці ног. Лепш выкарыстоўваць чаравікі ці ваўняныя шкарпэткі для таго, каб дайсці да палонкі. Магчыма выкарыстанне адмысловых гумовых тапачак, якія таксама абараняюць ногі ад вострых камянёў і не дадуць слізгаць на лёдзе. Ідучы да палонкі, памятайце, што дарожка можа быць слізкая. Ідзіце павольна і ўважліва.

4. Акунацца лепш за ўсё па шыю, не замачыўшы галаву, каб пазбегнуць рэфлекторнага звужэння сасудаў галаўнога мозга. Ніколі не кідайцеся ў палонку наперад галавой. Скачкі і апусканне ў ваду з галавой не рэкамендуюцца, бо гэта павялічвае страту тэмпературы і можа прывесці да шоку ад холаду.

5. Пры ўваходзе ў ваду першы раз старайцеся хутка дасягнуць патрэбнай вам глыбіні, але не плавайце. Памятайце, што халодная вада можа выклікаць зусім нармальнае бяспечнае пачашчанае дыханне.

6. Не знаходзьцеся ў палонцы больш за адну хвіліну, каб пазбегнуць агульнага пераахаладжэння арганізма.

7. Пасля купання разатрыце сябе махровым ручніком і надзеньце сухую вопратку.

8. Для ўмацавання імунітэту і зніжэння магчымасці пераахаладжэння неабходна выпіць гарачы чай, лепш за ўсё з ягад, садавіны і агародніны, з папярэдне падрыхтаванага тэрмаса.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# ЦЭНТРЫ БЯСПЕКІ БУДУЦЬ СТВОРАНЫ Ў КОЖНАЙ ВОБЛАСЦІ ДА 2020 ГОДА

**Беларускія ратаўнікі адзначаюць сваё прафесійнае свята 19 студзеня. Гэты дзень ужо па традыцыі становіцца нагодай, каб падвесці вынікі працы за мінулы год і акрэсліць планы на будучыню. Аб іх расказаў міністр па надзвычайных сітуацыях Уладзімір ВАШЧАНКА.**

— Нам вельмі патрэбна, каб да 2020 года ў кожнай вобласці быў створаны цэнтр бяспекі. Яны дапамогуць атрымаць веды не толькі ў сферы пажарнай і крымінальнай бяспекі, але і навучаць аказваць медыцынскую дапамогу... Як прыклад можна ўзяць Гомельскую вобласць. Доўгі час яна займала другое месца ў краіне па колькасці трагедый. А вось Брэстчына і Гродзеншчына стабільна знаходзіліся на апошніх месцах у гэтым спісе. Цяпер жа на Гомельшчыне цэнтр працуе тры гады, яго за гэты час наведалі дзясяткі тысяч людзей, большасць з якіх — дзеці. А што мы маем у выніку? Па ўдзельных паказчыках Гомельшчына цяпер выйшла на ўзровень Гродзеншчыны. І калі падобныя цэнтры запрацуюць ва ўсіх абласцях, то сітуацыя істотна палепшыцца. Таму для нас гэты складнік — адзін з прыярытэтных напрамкаў дзейнасці разам з прафілактыкай пажараў.

Летась былі адкрыты цэнтры бяспекі ў Віцебску і Лідзе. Сёлета да гэтага спісу далучыцца Магілёўшчына, як мяркуецца — у снежні. У Мінску і Брэсцкай вобласці вядуцца актыўныя работы. Напрыклад, у сталіцы цэнтр бяспекі размесціцца на Лагойскім тракце, ужо пачата яго будаўніцтва.

Сярод іншага на МНС ускладзена задача датычна бяспекі будучай Беларускай АЭС.

— Я лічу, што мы ідзём па правільным шляху і наша станцыя будзе самай бяспечнай, — мяркуе Уладзімір Вашчанка. — Велізарная нагрузка зараз у Дэпартамента па ядзернай і радыяцыйнай бяспецы. І звярніце ўвагу — жарсці ў нашых суседзяў зніклі. Атамную станцыю мы будуем для сябе. І таму максімальна зацікаўлены ў яе бяспецы.

Таксама напярэдадні Дня ратаўніка быў кардынальна абноўлены сайт Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Аб яго «фішках» расказаў **афіцыйны прадстаўнік ведамства Віталь НАВІЦКІ.**

— На галоўнай старонцы вы цяпер знойдзеце навіны ўсіх тэрытарыяльных упраўленняў МНС. Дзякуючы гэтаму можна аператыўна даведацца аб надзвычайных сітуацыях у любым пункце Беларусі. А сутачныя зводкі будуць суправаджацца інтэрактыўнай картай. Таксама працуе адаптыўная версія для мабільных прылад — смартфонаў, планшэтаў... Мы разумеем, што такімі гаджэтамі карыстаецца ўсё больш людзей, і таму не можам забывацца на гэта.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *schklennik@zviazda.by*

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## БЯСПЕЧНАЯ ПЕЧ

**З надыходам маразоў печы ў прыватных дамах паляцца па некалькі разоў на тыдзень. Менавіта ў такое надвор'е нельга прагграваць дом, моцна прапаліўшы печ адзін раз у дзень, пажадана рабіць гэта 2-3 разы. Таму ратавальнікі наведваюць прыватныя падворкі, каб не толькі абследаваць стан пячнога ацяплення, але і дапамагчы выправіць непаладкі.**



Інспектар Віталь ХАХЛОЎ і інжынер Алег СВІРЫД.

Супрацоўнікі Мінскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях праверылі стан печаў у вёсцы Новы двор Хацежынскага сельскага савета. Лякая вёска амаль уся газіфікаваная, але засталося два дзясяткі дамоў з печамі.

— Расколін няма, пячны ліст патрэбнага памеру... — аглядае першую хату **начальнік Мінскага раённага аддзела па надзвычайных справах Дзяніс ЖЫЛКО.**

Абавязкова — наяўнасць пажарных апавяшчальнікаў. Сёння ўсе правілы выкананыя. Але, на жаль, кожны дзень адбываецца пажары, менавіта таму МНС папярэджвае, што выкананне нескладаных правілаў можа дапамагчы захаваць сваё жыллё і жыццё блізкіх!

**Марына БЕГУНКОВА.**

*Мінская вобл.*

## АД УЗРЫВУ ГАЗАВАГА БАЛОНА

**У прыватным доме па вуліцы 4-й Першамайскай у Брэсце ўзарваўся газавы балон. Выбух прагрымеў а палове на шостую раніцы. Гаспадары дома пакінулі памяшканне да прыезду ратавальнікаў. Ніхто з людзей не пацярпеў. А вось жыллё разбурана моцна. Абрынулася цагляная сцяна, пажар знішчыў значную частку маёмасці. Гаспадар дома, яго жонка і дачка перабраліся да сваякоў.**

Прычыны здарэння высвятляюцца. Як паведаміў **афіцыйны прадстаўнік Брэсцкага абласнога ўпраўлення МНС Сяргей МАШНОЎ**, магчыма, выбух спраўкавала парушэнне правілаў эксплуатацыі газавага абсталявання. Але пакуль гэта толькі версія.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## ЛЕБЕДЗЬ, КАТЫ, САБАКА...

### Каму толькі не дапамагло МНС за апошні час

**Паведамленне пра параненую птушку, якая мае патрэбу ў дапамозе, паступіла бярэзінскім ратавальнікам ранкам ад работнікаў інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету.**

У лядовай пастцы на тэрыторыі возера каля аграгарадка Паплавы знаходзіўся лебедзь са зламаным крылом. Зразумела, птушка лётаць не магла, а вось загінуць — лёгка. Сумеснымі намаганнямі работнікаў МНС і інспекцыі лебедзя выратавалі. Яго адправіць жыць і лячыцца ў таварыства «Ахова птушак бацькаўшчыны».

І гэта далёка не адзіны выпадак такой дапамогі людзей братам нашым меншым. Напрыклад, днямі ў сталіцы кот забіўся пад кіёск, а сталічныя ратавальнікі дапамаглі дастаць жывёлу і перадалі яе гаспадыні. Здарэнне адбылося ў Мінску ранкам каля прыпынку на вуліцы Матусевіча. Жанчына везла ката ў ветэрынарную клініку, а той спужаўся, уцёк і забіўся пад кіёск «Белсаюздруку». Гаспадыня выклікала МНС. Ратавальнікі пры дапамозе гідраўлічнага інструмента прыпаднялі кіёск, дасталі ката і перадалі жанчыне.

У Мінскім гарадскім упраўленні МНС нагадалі: падобныя выпадкі не ўваходзяць у кампетэнцыю ратавальнікаў, кожны такі званок разглядаецца індывідуальна. Аднак, зыходзячы з разумення гуманізму і калі ў гэты момант дапамога людзям не патрабуецца, ратавальнікі адгукаюцца на падобныя выпадкі. Нагадаем, нядаўна работнікі сталічнага ўпраўлення МНС таксама прыйшлі на дапамогу кату, лапа якога захрасла ў батарэі ацяплення. А пасля гэта выратавалі сабаку, які праваліўся пад лёд на вадаёме.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ЗАРПЛАТА ЗА «МЁРТВЫЯ ДУШЫ»

**У сталіцы супрацоўнікі аддзела па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі Фрунзенскага РУУС затрымалі 51-гадовую загадчыцу інтэрната, якая падазраецца ў здзяйсненні крадзяжу грашовых сродкаў шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі.**

Было ўстаноўлена, што жанчына працавала загадчыцай інтэрната аднаго з будаўнічых прадпрыемстваў Мінска. З кастрычніка 2010-га па лістапад 2017 года яна фіктыўна працаўладкавала мужчыну на пасаду тэхнічнага персаналу, што дазволіла ёй завалодаць за названы прамежак часу грашовымі сродкамі ў суме больш за 18 тысяч рублёў. Таксама высветлілася, што са студзеня 2012-га па ліпень 2017 года ў гэтым жа інтэрнаце зноў жа фіктыўна працавала жанчына на пасадзе тэхнічнага персаналу. Налічаная заработная плата неіснуючай работніцы склала 15 тысяч рублёў. Як паведамілі ў Фрунзенскім РУУС г. Мінска, і грамадзянін, і грамадзянка раней насамрэч працавалі ў гэтым інтэрнаце, але пасля ўладкавання на іншыя рабочыя месцы перадалі банкаўскія карткі загадчыцы, якая іх не звольніла і абнаўлівала штомесяц грошы рэальна неіснуючых работнікаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

■ Турызм

# УСЁ ЎКЛЮЧАНА:

## у Мінску выпусцілі ў продаж Картку госця

**Гэта адзіная электронная картка для турыстаў, якая ўключае наведванне музеяў і экскурсій, праезд, а таксама выгадныя прапановы ад гасцініц, рэстаранаў і пракату транспартных сродкаў.**




Як расказаў **дырэктар УП «Мінгардаведка» Барыс ВАСІЛЬЕЎ**, картка створана на базе праязнога білета. Можна набыць варыянт на адны, двое ці трое сутак. Прычым такое абмежаванне было выбрана невыпадкова: пяцідзённы тэрмін бязвізавага знаходжання ў краіне ўключае дзень прыезду і ад'езду, таму для насычанай экскурсійнай праграмы застаецца роўна тры дні. Аднак у будучыні магчымасці, як па геаграфіі дзеяння, так і па тэрмінах, збіраюцца пашырыць.

Пакуль жа картка дае правa безлімітнага праезду на наземных відах транспарту і на дзесяць паездак на метро, а таксама магчымасць наведвання 74 аб'ектаў у Мінску і за яго межамі бясплатна або па спецыяльнай цане. Сярод іх 37 музеяў, у 13 з якіх з экспазіцыяй можна азнаёміцца бясплатна: напрыклад, у музеі Вялікай Айчыннай вайны, музеі архітэктурных мініяцюр «Краіна міні», Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага. 16 гасцініц, восем гандлёвых сетак, два турыстычныя аўтобусы, пракаты аўтамабіляў і веласіпедаў даюць зніжкі на свае тавары і паслугі ад 5 да 50 %. У доўгатэрміновай акцыі таксама прымаюць удзел Нацыянальная бібліятэка, аквапарк «Лебядзіны» і Мінскі заапарк, за наведванне якога, дарэчы, не прыйдзецца даплачваць. Калі казаць пра кошт самой карткі, то ён складае 45, 60 і 78 рублёў адпаведна кольказці дзён. Нават калі скарыстацца толькі дзясяццю частак усіх магчымасцяў, выгада становіцца відавочнай.

Набыць картку можна ў інфармацыйна-турыстычным цэнтры на вуліцы Рэвалюцыйнай, на чыгуначным вакзале і ў Верхнім горадзе. У найбліжэйшы час стэнд «Мінгардаведкі» з'явіцца і ў Нацыянальным аэрапорце. Дарэчы, заказаць картку можна і анлайн, пасля гэтага яе трэба актываваць на працягу года. У канцы снежня была абвешчана дзесяціпрацэнтная зніжка для тых, хто паспее купіць картку ва ўстаноўленыя тэрміны. Такой магчымасцю скарысталіся 29 чалавек, сярод якіх турысты з Кітая, Італіі, Германіі і Чэхіі.

У дадатак да карткі будзе выдавацца падрабязны даведнік, інфармацыя ў якім прадстаўлена на рускай і англійскай мовах. Таксама можна скарыстацца мабільнай праграмай або знайсці ўсе неабходныя звесткі на сайце minskpass.by. На самой картцы пазначаны нумар, па які можна звяртацца кругласутачна, аператары адкажуць па-руску і па-англійску.

Праца над карткай вялася на працягу года. Як адзначыў Барыс Васільеў, першапачаткова меркавалася, што да праграмы далучацца пяць музеяў, але на справе жаданне ўключыцца ў працэс выказалі куды больш удзельнікаў. Прычым сярод іх больш за дзясятак устаноў, якія размешчаны не на тэрыторыі сталіцы: музейны комплекс старадаўніх народных рамёстваў і тэхналогій «Дудуткі», замкавы комплекс «Мір», музей-запаведнік «Нясвіж», мемарыяльны комплекс «Хатынь», гісторыка-культурны комплекс «Лінія Сталіна» і многія іншыя. Акрамя ўдасканалення Карткі госця, у планах у «Мінгардаведкі» ёсць стварэнне асобнай падзейнай карткі, а таксама спецыяльнай прапановы да Еўрапейскіх гульняў.

Што датычыцца інфраструктуры, то на тэрыторыі Мінска працуе 51 гасцініца агульнай змяшчальнасцю на шэсць тысяч нумароў. На гэты год запланавана адкрыццё яшчэ трох новых гатэляў: на вуліцы Зыбіцкай, за кінатэатрам «Перамога» і недалёка ад аквапарку «Лебядзіны». Як расказаў **начальнік Упраўлення бытавога і гасцінічнага абслугоўвання насельніцтва Мінгарвыканкама Юрый НАТЫЧКА**, сярэдняя загружанасць гасцініц — 45 %, прычым паказчык вырас у параўнанні з мінулым годам на 5 %. У навагоднія святы сітуацыя склалася найлепшым чынам: у ноч з 31 снежня на 1 студзеня многія гасцініцы былі занятыя практычна цалкам, у астатнія дні запаўняльнасць склала крыху менш за 80 %.

Паводле статыстыкі, у сярэднім турысты праводзяць у Мінску 2-3 дні і выдаткоўваюць разам з пражываннем і харчаваннем каля 200 рублёў у суткі. Намеснік **начальніка ўпраўлення спорту і турызму Мінгарвыканкама Святлана ДЗЯМЕШКА** падкрэсліла, што ў мінулым годзе турызм у краіне істотна ажывіўся. Сёлета чакаецца значны прырост колькасці турыстаў з краін Азіі, у прыватнасці з Кітая. Дзеля гэтага ствараюцца ўсе неабходныя ўмовы: у многіх музеях ёсць аўдыягіды на кітайскай мове, у Мінску працуе 14 атэставаных экскурсаводаў, якія свабодна размаўляюць па-кітайску, ужо гатовы пераклад сістэмы прасторавага арыентавання, які хутка з'явіцца ў цэнтры горада. Пакуль жа часцей за ўсё магчымасцю бязвізавага ўезду самастойна карыстаюцца турысты з Германіі, Польшчы і Італіі, у рамках арганізаваных тураў — з Аўстрыі, Швейцарыі, Літвы.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*

# «ПЛАСТЫК» З БОНУСАМІ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Самая распаўсюджаная — Белкарт-Прэміум «Моцная картка». Пластык выпускаецца на 3—5 гадоў да рахункаў у беларускіх рублях. Абслугоўванне — ад 5 да 7,5 рубля ў год. Па заробкавых праектах картка выпускаецца бясплатна.

Спецыяльныя прапановы партнёраў праграмы: зніжкі да 50 % у больш чым 3000 магазінаў. Пры аплаце пакупак карткай вы атрымаеце бонусныя балы (10 рублёў = 1 бал), якія можна абмяняць на дадатковыя зніжкі. Калі вы разлічваецеся «Моцнай карткай» у прадпрыемствах-удзельніках сумесных праектаў, працэнт ад сумы вашай пакупкі (ад 0,2 % да 1 %) будзе пералічаны ў дабрачынны фонд «Моцная картка» за кошт уласных сродкаў гэтых прадпрыемстваў.

**Каб атрымаць пэўную зніжку або вяртанне кэшбэка, трэба карткай гэтай разлічвацца...**

«Моцныя карткі» ад некаторых банкаў даюць зніжкі ў многіх крамах горада, а таксама магчымасць удзельнічаць у бонуснай праграме, розыгрышы прызоў і акцыях.

Ёсць і пластык для эліты. Напрыклад Visa Global Card. Кошт абслугоўвання — 15 рублёў штогод. Картка прызначана для здзяйснення пакупак і экспрэс-афармлення чэкаў Tax Free кампаніі Global Blue. Яна таксама гарантуе вяртанне да 5 % ад сумы пакупак. Зняцце 1000 долараў ЗША ў месяц за мяжой без камісіі банка, браніраванне гатэляў на адпаведным інтэрнэт-партале і іншае.

А ёсць яшчэ картка «Visa Classic «Дынама—Мінск». Выпуск і абслугоўванне — бясплатныя. Калі ёсць абанемент або клубная карта хакейнага клуба «Дынама», можна атрымаць картку Visa Gold, тэрмін дзеяння якой — два гады. Уладальнік такой карткі можа атрымаць зніжку 10 % (ці 15 % для Visa Gold) у фірмовых крамах ХК «Дынама» на ўсе тавары, уключаючы білеты і абанементы. Бясплатна можна падключыць інтэрнэт-банкінг, мабільны банкінг і sms-банкінг, па картах Visa Gold — бясплатна падключыць sms-інфармаванне.

## Зніжкі трэба зарабіць

Асобна хацеў бы спыніцца на пласцежным пластыку «Моцная картка» — «Клопат». Яна афармляецца для пенсіянераў для залічэння пенсіі на тры гады. «Белкарт» выпускаецца бясплатна, MasterCard каштуе восем рублёў. Карткі прадугледжваюць падключэнне інтэрнэт-банкінгу і sms-апавяшчэнні, прадастаўленне зніжак у сетцы аптэк, разавую падпіску на адно з выданняў або грашовы падарунак ад банка, магчымасць адкрыцця ўкладу «Клопат».

Аформіла і мая матуля-пенсіянерка сабе такую картку. Пераканаў яе гэта зрабіць банкаўскі работнік. Штонебудзь змянілася? Не. Адзін раз у месяц ідзе яна да банкамата і здымае ўсе грошы наяўнымі. Сядзіць у хаце і чакае, пераканаіная, што ёй на картку грошы павінны «капаць». Мілая мама, каб атрымаць пэўную зніжку або вяртанне кэшбэка, трэба карткай гэтай разлічвацца...

## Небюджэтная іпатэка

З 3 студзеня сёлета дадзены старт партнёрскаму праекту Беларусбанка і найбуйнейшай міжнароднай групы кампаній Dana Holdings, — крэдыт «Іпатэка з намі».

**Намеснік старшыні праўлення Беларусбанка Святлана КАЖЭКІНА** ўпэўнена, што разам з гэтым крэдытам іх кліенты могуць рэалізаваць свае самыя смелыя планы. Справа ў тым, што працэнтная стаўка па крэдыце — гэта стаўка рэфінансавання Нацыянальнага банка краіны, а ў першыя тры гады працэнт па крэдыце зніжаны на 2,5 %.

Прадугледжана, што крэдытам магчыма аплаціць да 90 % кошту пакупкі ці будаўніцтва кватэры. «Акрамя таго, банк не прыспешвае з пагашэннем крэдыту, бо мы даём адтэрміноўку на пагашэнне асноўнага доўгу да 18 месяцаў з таго моманту, як вы сталі ўладальнікам сваёй мары», — тлумачыць Святлана Кажэкіна. Пры гэтым датэрміновае пагашэнне крэдыту ажыццяўляецца ў любы час без збірання штрафных санкцый.

**Такія крэдыты можна браць пад жыллё пэўнага, зусім не таннага забудоўшчыка.**

Няўжо кліентам банка проста пашанцавала? Паспрабуем разабрацца. Крэдыт «Іпатэка з намі» выдаецца для набыцця або будаўніцтва кватэры (у парадку долевага ўдзелу або шляхам набыцця жыллёвых аблігацый) і прадастаўляецца фізічным асобам, якія заключылі дагаворы з арганізацыямі-забудоўшчыкамі, што працуюць пад адзінай гандлёвай маркай. Партнёрскі праект дапаможа кліентам Беларусбанка стаць уладальнікам уласнай кватэры ў самых сучасных жылых кварталах Мінска, якія ўзводзяць гэтыя забудоўшчыкі. Вось яно што. Крэдыты можна браць пад жыллё пэўнага, зусім не таннага забудоўшчыка.

Вядома, што Беларусбанк проста так бонусы па крэдыце не зробіць. Страты яму кампенсуе партнёр забудоўшчык. А арганізатару будаўніцтва застанецца толькі падняць цэны... Тут сутнасць кабрэндынгу заключаецца ў аб'яднанні двух і больш брэндаў у адным праекце з мэтай павышэння продажаў кожнага з іх.




## Жоўтыя далоні

Ваша дзіця даўно просіць сваю картку? Вучыце яго фінансаваму планаванню? Тады варта паспрабаваць аформіць «Дзіцячую картку» БЕЛКАРТ-Стандарт у вашым банку. Перавагі «Дзіцячай карткі» вельмі шмат. Напрыклад, вы адправілі дзіця на вучобу ў іншы горад, і ў вас няма магчымасці часта перадаваць яму грошы. Магчыма, вы баіцеся, што ён раптоўна можа выдаткаваць усю перададзеную вамі суму кішэнных грошай. Нярэдкія таксама выпадкі крадзяжу наяўных сродкаў. Каб пазбегнуць такіх сітуацый, мэтазгодна адкрыць картку на імя дзіцяці.

**У выпадку страты карткі банк па званку бацькоў адразу ж яе заблакуе.**

«Дзіцячая картка» выпускаецца спецыяльна для непаўналетніх ва ўзросце ад шасці гадоў і афармляецца ў якасці дадатковай да рахунку аднаго з законных прадстаўнікоў (бацькоў, усынавіцеляў або апекуноў). Картка афармляецца толькі да рахунку ў беларускіх рублях і дапускае здзяйсненне аперацый (атрыманне наяўных, разлікі ў прадпрыемствах гандлю або сэрвісу) толькі на тэрыторыі Беларусі. Валютна-абменныя аперацыі з гэтай карткай забароненыя. Такая картка — гэта добрая магчымасць для дзяцей навучыцца планаваць свае выдаткі і карыстацца банкаўскімі паслугамі.

Кіраванне рахункам ажыццяўляюць бацькі. Яны ўносяць грошы на рахунак, кантралююць усе аперацыі і могуць у рэжыме рэальнага часу даведвацца аб стане і балансе рахунку. Усё гэта можна рабіць з дапамогай сэрвісаў «Інтэрнэт-Банк» і «sms-апавяшчэнне». Аб любой расходнай аперацыі па рахунку ўладальнік асноўнай карткі можа быць праінфармаваны з дапамогай паслугі «sms-апавяшчэнне». У выпадку страты карткі банк па званку бацькоў адразу ж яе заблакуе. А яшчэ адзін з банкаў распрацаваў тры варыянты дызайну «Дзіцячай карткі», з якіх маленькі кліент можа выбраць самы прывабны для сябе. Гэты банк выпускае пластык з намаляванымі на ім жоўтымі далонямі бясплатна.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Фінансы

# У БЕЛАРУСІ ЗАПРАЦАВАЛА НОВАЯ ПЛАЦЕЖНАЯ СІСТЭМА — ЯПОНСКАЯ JCB

**Да міжнародных плацежных сістэм Mastercard, Visa, UnionPay, American Express і нацыянальнай плацежнай сістэмы «Белкарт» з гэтага года дадалася JCB — пятая па ліку карыстальнікаў у свеце і трэцяя па колькасці кропак прыёму. Старт работы JCB адбыўся 16 студзеня ў сетцы Белінвестбанка, дзе будуць эксклюзіўна абслугоўвацца карты новай для Беларусі плацежнай сістэмы.**

Вядома, што летась турыстычны паток у Беларусь павялічыўся амаль на 15 % у параўнанні з 2016-м. Ужо сёлета плануецца прыняць яшчэ больш замежных гасцей. Гэта стала магчыма дзякуючы прадаўжэнню з 1 студзеня 2018 года тэрміну бязвізавага знаходжання турыстаў да 10 дзён у Гродзенскай і Брэсцкай абласцях. У спісе на бязвізавы ўезд знаходзіцца 77 краін, у тым ліку Кітай, Японія, ЗША. Менавіта на іх, а таксама на турыстаў і бізнесменаў з Расіі арыентавана новая плацежная сістэма. Карткі JCB выпускаюцца ў 23 краінах свету, яе карыстальнікамі з'яўляюцца больш за 105 млн чалавек, якія пражываюць пераважна ў краінах Азіі.

— Уяўленне замежных гасцей пра бізнес-патэнцыял краіны фарміруецца ў тым ліку і паводле таго, наколькі развітая яе банкаўская сістэма, — расказвае **Андрэй БРЫШТЭЛЬ, старшыня праўлення Белінвестбанка.** — Сетка нашага банка цалкам гатовая да прыёму картак JCB. Гэтаму папярэднічала сур'ёзная работа па наладжванню і сертыфікацыі праграмнага забеспячэння. Устаноўлены прамы канал сувязі з плацежнай сістэмай JCB. Сёння КартЦэнтр Белінвестбанка адзіны ў Беларусі здольны самастойна апрацоўваць аперацыі па гэтых картках. Гэта сур'ёзны крок у развіцці і істотнае пашырэнне магчымасцяў банка. Для нашых гасцей, трымальнікаў картак JCB, сталі даступныя каля 500 банкаматаў і 220 інфакіёскаў Белінвестбанка, а таксама больш як 7300 гандлёвых пунктаў, у тым ліку каля 2300 у Мінску. У планах пашырэнне сеткі прыёму картак JCB дзякуючы падключэнню да сістэмы іншых банкаў праз працэсінгавы цэнтр Белінвестбанка.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
18 СТУДЗЕНЯ 2018 г.
ЧАЦВЕР
№ 2 (15833)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

## Дар'я РЭУТ:

# «Сям'я заўсёды — на першым месцы»




**З конкурсу «Місіс свету», які праходзіў напрыканцы мінулага года ў паўднёваафрыканскім Яганэсбургу, беларуска прывезла тытул «Другая Віцэ-Місіс свету». Дар'я расказала, як ёй удалося ўвайсці ў тройку найлепшых.**

***— Як вызначалі пераможцу?***

— Па выніках трох этапаў. Першы — інтэрв'ю на англійскай мове. Кожная ўдзельніца па пяць хвілін размаўляе з кожным членам журы. Так у іх склалася сваё меркаванне пра ўсіх нас. Некаторым удзельніцам, для якіх англійская мова родная, на гэтым этапе было, зразумела, прасцей. Я валодаю англійскай не дасканала, але на неблагім узроўні. Добра, што была магчымасць да інтэрв'ю падрыхтавацца, зрабіць пэўныя загатоўкі. Задавалі і дадатковыя пытанні, часцей за ўсё «Чаму ты хочаш стаць Місіс свету?»

Затым праходзіла шоу з выхадамі ў купальніках, вячэрніх сукенках і нацыянальных касцюмах. Мяркую, ужо тады журы вызначыла, хто будзе ў топ-12. Трэці этап — фінальны, з усё тымі ж выхадамі плюс дэфіле ў нацыянальным паўднёваафрыканскім касцюме. Гэты этап быў ужо з гледачамі, таму ў конкурсную праграму ўключылі танцавальныя элементы з дадаткова запрошанымі танцорамі і спевакамі. Там выбіралі топ-12 прыгажунь, пасля топ-6, і нарэшце, топ-3.

***— Што было самае важнае для перамогі?***

— Як казалі самі арганізатары, яе палову складала паспяховае інтэрв'ю, чвэрць — выхад у нацыянальным касцюме, яшчэ чвэрць — у вячэрняй сукенцы. Зразумела, што галоўную ролю іграла ўнутраная прыгажосць і той сацыяльны праект, які трэба было прадставіць на конкурсе. А таксама ўменне трымацца на сцэне і паднесці сябе. Бо ацаніць аб'ектыўна знешнія даныя 35 удзельніц немагчыма. Гэта былі як дзяўчаты ад 24 гадоў, так і жанчыны за 40, тыя, у каго яшчэ няма дзяцей, і тыя, у каго іх пяцёра.

***— У вас быў цікавы нацыянальны касцюм...***

— Яго рабіла беларускі дызайнер Ганна Забеліна. Я бачыла яе работы раней і папрасіла стварыць штосьці незвычайнае, запамінальнае і стыльнае. Ганна зрабіла паліто васількаватага колеру, з вышытымі матывамі беларускага лесу і жывёламі. Яно было апранута на доўгую шыфонавую сукенку, дапаўнялі вобраз капялюшык і брошка. Усё выглядала даволі выйгрышна.

***— Колькі, дарэчы, чамаданаў адзення ўзялі з сабой?***

— Тры, і быў лішак. Праўда, у параўнанні з тым, што везлі іншыя ўдзельніцы, з таго ж Рыа-дэ-Жанэйра, дзе нацыянальны касцюм упрыгожвала пер'е, у мяне быў невялікі багаж. Калі ляцела дадому, было прасцей — раздарыла падарункі. Па задуме арганізатараў, кожная ўдзельніца павінна была падарыць усім астатнім невялікія сувеніры. Я дарыла беларускую касметыку — гэта выдатная нагода паказаць, што ў нас ёсць якасныя тавары, а таксама беларускі зефір.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Дысцыпліна на слыху

# ЗЛАВІЦЬ ХВАЛЮ,

## або Навошта спартсмену ведаць «марзянку»

**Запісаць пяць літар у секунду, расшыфраваць пасланне з кропак і працяжнікаў, знайсці перадатчык, схаваны за некалькі кіламетраў... Гэта не сцэна з баевіка, а звычайная трэніроўка. Для чаго школьнікам ведаць «сакрэтны код» і чаму будучыя чэмпіёны займаюцца з закрытымі вачыма, мы даведаліся ў адзінай у краіне спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай спартыўна-тэхнічнай школе па радыёспорце ДТСААФ.**

### Добры слых і выдатная памяць

Школьнікі, якія займаюцца хуткаснай радыётэлеграфіяй, мала падобныя да спартсменаў у класічным уяўленні: сядзяць за партамі ў навушніках і пішуць нешта ў сшыткі. Так яны вучацца прымаць і перадаваць тэксты з дапамогай азбукі Морзэ. Сам тэкст — гэта выпадковы набор літар, лічбаў ці таго і другога, які перадаецца групамі па пяць знакаў.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)*



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Чэмпіёнка Ганна Шэвяленка трэніруе юных спартсменаў.

Свой выбар

# «Следчым вырашыў быць з дзяцінства»

**Малады спецыяліст Ігар САЛАНЕВІЧ больш за два гады таму прыйшоў працаваць у першае следчае аддзяленне Баранавіцкага міжраённага аддзела Следчага камітэта. Сам хлопец мясцовы, тут жа скончыў школу і паступіў у Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт на спецыяльнасць «Правазнаўства».**



Ігар Саланевіч на працоўным месцы.

— Бацькі заўсёды ўхвалялі мой выбар прафесіі. З самага дзяцінства! Пачыналася з банальнага: бабуля губляла акуляры, ключ. Хто знойдзе? Канешне, Ігар! Знаходзіў рэчы я дастаткова хутка, а дарослыя — у адзін голас: «Будзеш следчым!» Дома толькі так мяне і называлі. Бацькі з маёй прафесіяй ніяк не звязаны: мама — кухар, бацька — будаўнік. Але яны заўсёды падтрымлівалі, таму што нават у дзяцінстве мой выбар здаваўся ім дарослым і абдуманым, — кажа суразмоўца.

Поўнае ж усведамленне правільнасці выбару прыйшло ва ўніверсітэце на другім курсе. Праходзіла штогадовая ўніверсітэцкая юрыдычная алімпіяда, якая ахоплівае веды ў працоўным, грамадзянскім, крымінальным і крымінальна-працэсуальным праве. Па выніках члены журы (у яго ўваходзяць эксперты-практыкі) выбіраюць самых лепшых. «Дзякуючы гэтай алімпіядзе я не толькі яшчэ больш «захапіўся» сваім выбарам, але і пазнаёміўся з сапраўднымі прафесіяналамі ў следчай справе. І на пераддыпломную практыку прыйшоў у міжраённы аддзел. А потым з «чырвоным» дыпломам — і на пастаянную работу».

— Працоўны дзень пачынаецца з дзевяці раніцы. Пяціхвілінка, планаванне, накіраванне крымінальных спраў у суд... Таксама выходзім на дзяжурныя суткі — гэта калі ты знаходзішся ў аддзеле і цягам гэтага часу ў выпадку патрэбы ў складзе следча-аператыўнай групы выязджаеш на месцы здарэнняў, — расказвае Ігар пра свае працоўныя будні.

На першым паўгода яму прызначылі настаўніка, які дапамагаў уваходзіць у курс справы максімальна аператыўна і якасна. Так заведзена, што маладым дапамагаюць — і словам, і справай — і яны, і іншыя старэйшыя калегі. І не толькі шэсць месяцаў. Трэба дакладна сачыць за тэрмінамі — завядзення крымінальнай справы, затрымання. У тэорыі гэта прапісана, але як лічыць? Як укласціся? Напрыклад, затрымліваецца асоба, што падазраецца ў здзяйсненні злачынства. З моманту затрымання ёсць трое сутак. За гэты тэрмін трэба дапытаць сведак, пацярпелых. Калі ёсць супярэчнасці паміж паказаннямі, выявіць іх. А работа з людзьмі — дастаткова складаная, бо ніколі нельга прадказаць, што ад каго чакаць.

— У нашай працы вельмі важнае — планаванне. Без яго — за некалькі дзён — нічога немагчыма зрабіць. Бо выклікаць чалавека на допыт трэба як мінімум за дзень, а калі грамадзянін з раёна — за два-тры. Ды і зрабіць гэта — таксама складаная задача: адключаюць тэлефон, хаваюцца... Зараз дазваляецца выклікаць не толькі позвай, а нават перадаваць праз кагосьці. Па законе чалавек павінен прыбыць. Але прыходзілася і ў чатыры раніцы шукаць, — расказвае следчы.

У яго практыцы былі розныя расследаванні. Хуліганствы, крадзяжы, прычыненне цялесных пашкоджанняў, выкраданні транспарту. Ігару запомнілася некалькі выпадкаў. Парык, акуляры на палову твару, някідкае адзенне, крама... Устанавіць злачынцаў-кішэннікаў у такім выпадку вельмі складана. Але ўдалося.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
18 01 2018 г.

Майстар-клас

# ПАКАЛЕННЕ ВІЗУАЛАЎ

## Як вучыць дзяцей з кліпавым мысленнем?

**А ці ведаеце вы, што калі скласці даўжыню ўсіх Савецкіх вуліц населеных пунктаў Беларусі, то атрымаецца «магістраль» працягласцю ў 698 кіламетраў! А калі выцягнуць у адну лінію вуліцы, названыя ў гонар правадыра Кастрычніцкай рэвалюцыі, яна расцягнецца на 440 кіламетраў. І зусім нямнога адстаюць па агульнай працягласці (382 кіламетры) Кастрычніцкія вуліцы. Савецкая тапаніміка працягвае ў нашых гарадах пераважаць. Дар'я КАСЯКОВА, настаўнік гісторыі і грамадазнаўства з 34-й сталічнай гімназіі, упэўнена, што тапаніміка — адзін з эфектыўных рэсурсаў для вывучэння гісторыі. Падчас VII Рэспубліканскага каляндарнага фестывалю педагагічнага майстэрства малады педагог расказала сваім калегам, як можна сабраць мазаіку гісторыі, выкарыстоўваючы самыя розныя крыніцы інфармацыі на сваім уроку: пачынаючы ад савецкіх плакатаў і заканчваючы мелодыямі з савецкіх фільмаў.**




Дар'я Касякова: «Сабраць мазаіку гісторыі на ўроку можна, выкарыстоўваючы самыя розныя крыніцы інфармацыі...»

### Ёлачныя цацкі з падтэкстам

Дзякуючы картаграфічным інтэрнэт-рэсурсам, напрыклад такім, як OpenStreetMap, можна даведацца, што амаль ва ўсіх сталіцах краін былога сацыялістычнага лагера ёсць вуліца 1 Мая. А вось гістарычныя асобы, звязаныя з Беларуссю, займаюць у нашай тапаніміцы пакуль вельмі сціплае месца. Статыстычныя звесткі сведчаць, што часцей за ўсё падчас прагулак па беларускіх населеных пунктах там можна «сустрэць» Леніна — у яго гонар названыя 479 284 самыя розныя аб'екты ў краіне: вуліцы, плошчы, скверы, паркі, бібліятэкі, прыпыначныя пункты, станцыя метро. На другім месцы ідзе Янка Купала: імя слыннага беларускага паэта згадваецца 82 888 разоў, або ў пяць разоў радзей, чым правадыра рэвалюцыі. На трэцім — Якуб Колас (81 372 згадкі). Намнога радзей «гучаць» Францыск Скарына, Кастусь Каліноўскі і Максім Багдановіч.

— Як вы думаеце, якія медыятэкст самы навагодні? — цікавіцца Дар'я. — Ну, канешне, гэта навагодняя ёлачныя цацкі. Але не сучасныя, якія выконваюць ролю звычайнага ўпрыгажэння, а савецкія. Калі я была маленькая, не разумела, што за нейкія дзіўныя фігуркі вісяць у маёй бабулі на ёлцы. Старыя савецкія ўпрыгажэнні, якія бацькі замянілі на новыя, дзеці часта прыносяць у школу як непатрэбныя, не шкада, нават калі разаб'юцца. Але мае вучні ўжо разумеюць іх каштоўнасць. Асабліва адметны ў гісторыі ёлачных цацак быў хрушчоўскі перыяд, калі з'явіліся цацкі, прысвечаныя выхаду фільма «Карнавальная ноч» (гадзіннік, на якім стрэлка застыла за пяць хвілін да наступлення Новага года), вырошчванню кукурузы — галоўнай на той момант сельскагаспадарчай культуры, Сусветнаму фестывалю моладзі і студэнтаў у Маскве (голуб міру), ну і, канешне, пакарэнню космасу. Акрамя фігурак касманаўтаў і ракет з'яўляюцца і новыя касмічныя верхавіны на навагоднее дрэва, якія сталі альтэрнатывай савецкім зоркам. Адзем заўсёды цікава даведацца, з якой гістарычнай падзеяй у жыцці краіны было звязана стварэнне таго ці іншага ўпрыгажэння і якія каштоўнасці транслюе канкрэтны медыятэкст.

### Зазірнуць у вочы гісторыі

Пры вывучэнні савецкага перыяду добрай падмогай для настаўніцы стаў Беларускі архіў вуснай гісторыі, які ахоплівае падзеі ад рэвалюцыйных часоў да чарнобыльскай трагедыі і сучаснасці. Яго базамі можа свабодна карыстацца любы педагог. «Лічбы нічога дзіцяці не даюць, — упэўнена Дар'я Касякова. — Яны будуць іх памятаць максімум да наступнага ўрока гісторыі. І зусім іншая справа, калі пра тыя ж падзеі расказваюць звычайныя людзі. Праз лёс маленькага чалавека можна даследаваць цэлую эпоху. Канешне, аповеды могуць быць суб'ектыўныя, але менавіта ў суб'ектыўнасці і хаваецца іх галоўная каштоўнасць. Дзеці атрымліваюць не проста гістарычную інфармацыю, а разумеюць стаўленне простых людзей да той ці іншай гістарычнай падзеі праз іх прызму каштоўнасцяў, як яна паўплывала на іх жыццё, на лёс блізкіх ім людзей, прычым гэта ўжо не проста параграф ці абзац у школьным падручніку».

Вельмі важная тэма — аб'яднанне ў 1939 годзе Заходняй і Усходняй Беларусі. У архіве ёсць багата ўспамінаў пра тыя падзеі жыхароў як далучаных тэрыторый, так і савецкіх. Як яны бачылі адзін аднаго, што прымалі ці не прымалі «заходнікі» ў савецкім ладзе жыцця, за што «калгаснікі» недалюблівалі «паноў»?

**«Дзяцей нельга перагружаць вялікімі аб'ёмамі інфармацыі. Іх увагу трэба паспрабаваць адразу зачапіць».**

— Калі я паказваю дзецям успаміны, прысвечаныя 1939 году, то стаўлю перад імі шэраг пытанняў, на якія яны павінны знайсці адказ. Якія падзеі папярэднічалі аб'яднанню? Ці існавала розніца паміж усходнімі і заходнімі тэрыторыямі Беларусі, у чым яна праяўлялася? Ці захаваліся адрозненні паміж заходняй і ўсходняй Беларуссю сёння? У чым яны праяўляюцца? — падкрэслівае настаўніца.

### Мядзведзеў быў... на МКС

**Настаўнік гісторыі і грамадазнаўства аршанскай сярэдняй школы № 3, суперфіналіст апошняга Рэспубліканскага конкурсу «Настаўнік года — 2017» Андрэй ІВАНОЎ** прадэманстраваў у рамках свайго майстар-класа на фестывалі відэаролік аб знаходжанні дзеючага прэм'ер-міністра Расійскай Федэрацыі Дзмітрыя Мядзведзева на... міжнароднай касмічнай станцыі «МІР».

«Дэпартамент прэс-службы інфармацыі ўрада Расійскай Федэрацыі паведаміў, што падчас знаходжання на калязямной арбіце Дзмітрый Мядзведзеў прыняў самы актыўны ўдзел у даследчай дзейнасці касманаўтаў, як паўнапраўны член экіпажа. Даследаванні былі накіраваныя на атрыманне фундаментальных звестак аб улацівасцях арганічных кіслот, якія ўтрымліваюцца ў мінеральнай вадзе пад уздзеяннем рознай тэмпературы і нулявой гравітацыі. Рэпартаж аб тыднёвым знаходжанні прэм'ер-міністра на МКС глядзіце ў спецыяльным нядзельным выпуску навін», — паведамлялася ў ролiку, дзе Дзмітрый Мядзведзеў перамяшчаўся ў бязважкасці па касмічнай станцыі.

«Калі адбылася гэта падзея?», — пацікавіўся Андрэй Іваноў у калег і пачуў у адказ: «У XXI стагоддзі!», «1 красавіка», «Ніколі»...

Як высветлілася пазней, звычайна ў кожнай аўдыторыі знаходзіцца прыкладна 30 % педагогаў, якія ўспрымаюць убачанае за чыстую манету. Між іншым, гэта проста жарт, прыгожая дарагая рэклама мінеральнай вады, з вельмі якаснымі здымкамі, скрупулёзна прадуманымі дэталямі — усё прымушае гледача паверыць у тое, што палёт у космас аднаго з кіраўнікоў дзяржавы — цалкам магчымы...

— Чаму нас вучыць гэты відэаролік? Калі вы збіраецеся выкарыстоўваць на сваіх уроках відэаматэрыялы, то самі павінны ўмець крытычна іх ацэньваць, каб перадаваць каштоўны вопыт сваім вучням. Безумоўна, у відэаматэрыялаў ёсць шмат пераваг перад тэкстам: выбіраючы паміж «паглядзець» ці «пачытаць», школьнікі, канешне, выберуць першы варыянт. Пад відэаматэрыяламі я маю на ўвазе дакументальныя і мастацкія фільмы, відэакліпы і мультфільмы, відэаінтэрв'ю гістарычных дзеячаў і рэкламныя ролікі. Але і мінусы ў іх таксама ёсць, якія абавязкова трэба ўлічваць. Па-першае, нам могуць навязваць пэўныя вобразы, у якіх прысутнічаюць мастацкі вымысел і тэндэнцыйнасць, а калі мы ўспрымаем інфармацыю эмацыянальна, то «адключаем галаву...», — папярэджвае Андрэй Іваноў.

### Чаму не хлусіў Скацінін?

— Літаратура, гісторыя, грамадазнаўства даюць вельмі багаты матэрыял для работы з маніпуляцыямі і стэрэатыпамі, — упэўнена **дырэктар столінскай сярэдняй школы № 2, настаўнік рускай мовы і літаратуры Ала ЛАЗІЦКАЯ.** — Увогуле фарміраваннем чытацкай пісьменнасці і медыяадукацыяй можна займацца на любых занятках. Многія памылкова думаюць, што медыяадукацыя азначае, што на кожны ўрок настаўнік павінен прынесці газету, постар, прадэманстраваць відэаролік і г. д. Не варта гнацца за пустымі спецэфектамі. Для мяне заўсёды было важным пераканаць дзяцей у тым, што класікі, з творамі якіх яны знаёмяцца на ўроках літаратуры, не нейкія кананізаваныя асобы. Іх творчасць застаецца актуальнай і сучаснай па сённяшні дзень, менавіта таму іх і лічаць класікамі. Я раблю гэта праз праектную дзейнасць. Напрыклад, пры вывучэнні камедыі Д. Фанвізіна «Недарасль» мае вучні аналізавалі, хто з герояў хлусіць, а хто кажа праўду, і высветлілася, што не хлусіць толькі Скацінін. Проста таму, што ў яго няма ў гэтым патрэбы. На вобразе Мітрафанушкі даследавалі, як ствараецца імідж паспяховага чалавека, знайшлі падручнік па іміджалогіі і прааналізавалі па ім усе дзеянні матулі Мітрафанушкі — галоўнага яго «іміджмейкера», зразумелі, чаму ёй гэта не ўдалося. Пры вывучэнні рамана І. Тургенева «Бацькі і дзеці» вучні шукалі маніпуляцыі ў паводзінах персанажаў: знайшлі ў кніжках па сацыяльнай псіхалогіі тэхнікі маніпуляцый і ўбачылі, як героі аказвалі псіхалагічны ціск адзін на аднаго і якое вялікае значэнне маюць дыялогі персанажаў. Пасля чаго паглядзелі на Базарава і іншых тургенеўскіх герояў зусім іншымі вачыма.

**«Пры вывучэнні рамана І. Тургенева «Бацькі і дзеці» вучні шукалі маніпуляцыі ў паводзінах персанажаў».**

«Мёртвыя душы» Мікалая Гогаля заўсёды ўспрымаюцца школьнікамі складана. Каб неяк зацікавіць дзяцей, першы ўрок мы прысвяцілі вывучэнню інфармацыйнай прасторы губернскага горада N, па якім прагуляліся разам з Чычыкавым: шыльдам на вуліцах, тэатральным афішам, надпісу на плоце «прадам душу», мясцовай газеце. Паглядзелі ўрывак з экранізацыі рамана 1984 года. Потым было зададзене зрабіць цытатную характарыстыку Чычыкава, падзяліць крыніцы — чыя гэта пазіцыя і бачанне (аўтара, самога Чычыкава ці так пра героя кажуць іншыя). Ці не з'яўляецца меркаванне пра чалавека, якога ўсе бачаць першы раз, інтэрпрэтацыяй? На якіх падставах яно ствараецца? А далей знаёмства з раманам ужо пайшло весялей.

### Інфаграфіка — замест рэферата

Ад лірыкаў — да фізікаў. **Намеснік дырэктара жлобінскай сярэдняй школы № 13 Алена АНАНЧЫКАВА, настаўнікі фізікі Эла ЯКУБОЎСКАЯ (гімназія № 1 г. Жодзіна) і Аляксандр ЯКУБОЎСКІ (Жодзінская жаночая гімназія)** прысвяцілі свой майстар-клас фактарам, прыёмам і сродкам інтэлектуальнага развіцця навучэнцаў на ўроках фізікі: размова ідзе пра тое, як якасці, як кемлівасць, гнуткасць, крытычнасць, самастойнасць, экамічнасць. Фізіка — прадмет у школьнікаў, шчыра кажучы, не самы любімы і даволі складаны.

— Зараз мы вучым дзяцей, якіх адносяць да пакалення Z. Пра іх кажуць яшчэ «народжаныя лічбавай рэвалюцыяй». Гэта пакаленне візуалаў, якія патрабуюць «закончанага сюжэта» і высокай дынамікі ў ходзе яго развіцця. Кантактуюць і спажываюць інфармацыю яны пры дапамозе кароткіх відэа, тэгаў і мемаў, — тлумачыць Аляксандр Якубоўскі. — Для сучаснай моладзі ўвогуле ўласціва кліпавае мысленне, яны могуць выконваць некалькі спраў адначасова, аддаюць перавагу графічнаму малюнку перад тэкстам. Дзеці, якія выраслі ў эпоху высокіх тэхналогій, па-іншаму глядзяць на свет. Іх успрыманне — не паслядоўнае і не тэкставае. Яны бачаць карціну ў цэлым і ўспрымаюць інфармацыю па прынцыпе кліпа. Такім чынам, **узнікае практычная праблема для педагогаў — як змяніць тэхналогіі «падачы» навучальнага матэрыялу, каб сучасным навучэнцам было камфортна, не парушыўшы пры гэтым вядучых дыдактычных прынцыпаў?** Адным з інструментаў з'яўляецца інфаграфіка, якая ў большай ступені адпавядае нашаму лічбаваму свету і дазваляе лягчэй запомніць неабходную інфармацыю пакаленню дзяцей-візуалаў.

Адукацыйная інфаграфіка ўяўляе сабой закончаны візуальна-інфармацыйны блок вучэбнага матэрыялу, які можна вывучыць самастойна, без чыёй-небудзь дапамогі, а пасля аналізаваць, рабіць высновы і знаходзіць дадатковыя сэнсы. Як адзін з метадаў візуалізацыі вучэбнай інфармацыі інфаграфіка можа выкарыстоўвацца на вучэбных занятках для стварэння праблемных сітуацый і арганізацыі эфектыўнай пошукавай дзейнасці.

— Дзяцей нельга перагружаць вялікімі аб'ёмамі інфармацыі, — упэўнена Эла Якубоўская. — Іх увагу трэба паспрабаваць адразу зачапіць. Пры засваенні невялікіх доз вучэбнага матэрыялу, калі патрабуецца ўстанаўленне прычынна-выніковых сувязяў, сістэматызацыя і абагульненне прачытанага, эфектыўна прыбягаць да кластараў, якія да таго ж прывучаюць дзяцей аналізаваць інфармацыю і выдзяляць з яе галоўнае. Кластар — гэта графічная форма арганізацыі інфармацыі, калі выдзяляюцца асноўныя сэнсавыя адзінкі і затым яны фіксуюцца ў выглядзе схемы з пазначэннем усіх сувязяў паміж імі.

— А пры засваенні вялікіх тэм у старшых класах лепш звяртацца да інтэлект-картаў, паколькі тыя дазваляюць адлюстраваць самыя розныя сувязі ўнутры тэмы, — раіць Алена Ананчыкава. — Інтэлект-карты — добрыя памочнікі ў падрыхтоўцы да ЦТ, паколькі дапамагаюць структураваць і сістэматызаваць вялікі аб'ём вучэбнага матэрыялу ў найбольш даступнай для навучэнца форме. Яшчэ адзін несумненны плюс інтэлект-картаў — дапамога ў вырашэнні адукацыйных задач, звязаных з вызначэннем пазнавальнай мэты, пошукам інфармацыі, развіццём крэатыўнасці.

У сітуацыі, калі навучэнцам даступная велізарная колькасць інфармацыйных крыніц (кніг, часопісаў, рэсурсаў інтэрнэту), напісанне рэфератаў часцяком зводзіцца да механічнага запампоўвання гатовага тэксту або капіравання асобных яго частак з сеціва. Вось толькі які працэнт матэрыялу запомніць вучань пры выкананні такой работы? І ці запомніць хоць нешта наогул? Таму настаўнікі-метадысты раяць замяніць рэфераты стварэннем інфаграфікі. Такія візуальныя сродкі можна паспяхова выкарыстоўваць на самых розных прадметах.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

Добрыя сэрцам

# Прывезці казку і навучыць англійскай

## Як будучыя лінгвісты дапамагаюць выхаванцам дзіцячых дамоў

**Атрад «Мы — дзецям» пярвічнай арганізацыі з правамі раённага камітэта ГА «БРСМ» Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта стаў найлепшым валанцёрскім атрадам сярод студэнцкай моладзі па выніках рэспубліканскага конкурсу «Валанцёр года — Добрае Сэрца». Яго кіраўнік трэцякурсніца Хрысціна БРАГІНЕЦ расказала, як хлопцы і дзяўчаты ездзяць у інтэрнаты са спектаклямі і выконваюць навагоднія жаданні падапечных.**



Да дзяцей студэнты прыязджаюць з падарункамі і спектаклямі.

Сама дзяўчына запісалася ў валанцёры яшчэ на першым курсе. «На ўводным сходзе, калі нам расказвалі пра кірункі дзейнасці, якімі можна займацца ва ўніверсітэце, убачыла фота з дзецьмі і зразумела, што хачу ім дапамагаць. Я заўсёды любіла малых: памятаю, як прасіла маму аб браціку ці сястрычцы», — усміхаецца будучы лінгвіст-выкладчык.

Усяго ў атрадзе каля 250 валанцёраў. Яны супрацоўнічаюць з дзіцячым домам № 5 у Мінску, сталічнай дапаможнай школай-інтэрнатам № 7, Барысаўскім домам дзіцяці, Ждановіцкім дашкольным дзіцячым домам і іншымі ўстановамі. Студэнты збіраюць для малых кнігі (энцыклапедыі і мастацкую літаратуру), праводзяць майстар-класы — па арыгамі, вакале і акцёрскім майстэрстве, тайскім боксе. Займаюцца са школьнікамі рэпетытарствам: «падцягваюць» з імі англійскую і італьянскую мовы (апошняя запатрабаваная, бо выхаванцы інтэрнатаў ездзяць у гэтую краіну на аздараўленне і адпачынак).

На базе атрада дзейнічаюць два тэатры — «Разам у казку» і «Мімы спяшаюцца на дапамогу». Студэнты самі шыюць сабе касцюмы і пішуць сцэнарыі. У рэпертуары ёсць пастаноўкі «Бураціна», «Прынцэса і жабка», «Рапунцэль», «Несмяяна». Валанцёры спрабуюць інтэрпрэтаваць казкі на сучасны манер, каб было цікава і першакласнікам, і больш старэйшым. Хрысціна расказала, што яны плануюць адкрыць яшчэ і лялечны тэатр, разлічаны на малечу.

Для выхаванцаў інтэрнатаў таксама арганізуюць паездкі. Студэнты вазілі дзяцей у дэльфінарый, кантактны заапарк. Установы ідуць насустрач і квіткі прадастаўляюць бясплатна, а для валанцёраў — з 50-працэнтнай зніжкай.

На Новы год будучыя лінгвісты рэгулярна праводзяць акцыю «Ёлка жаданняў» у адным са сталічных супермаркетаў. На святочнае дрэва вешаюць лісты для Дзеда Мароза, якія папярэдне пішуць дзеці з інтэрнатаў. А пакупнікі могуць выканаць любое з гэтых жаданняў. Дзятва звычайна просіць машынкі, лялькі, канструктары. Гэтым разам падарункаў сабралі нават больш, чым было выказана пажаданняў. Таму акрамя выхаванцаў двух інтэрнатаў валанцёры змаглі павіншаваць і пацыентаў Цэнтра дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі ў Бараўлянах.

Цікава, што да акцый далучаюцца і педагогі ўніверсітэта. Так, адна з выкладчыц передала 300 рублёў на падарункі падапечным атрада да Новага года.

Універсітэт заахвочвае валанцёрскую дзейнасць надбаўкамі да стыпендыі.

— Мы таксама стараемся нашых валанцёраў стымуляваць — граматы выпісваем, мерапрыемствы для іх арганізуем, — дадае Хрысціна. — Часам даводзіцца прапускаць заняткі, але выкладчыкі ставяцца да гэтага пераважна з паразуменнем. Галоўнае — не злоўжываць. Калі ў цябе шмат прагулаў, не трэба прыкрываць валанцёрствам. Калі запрашаем студэнтаў паўдзельнічаць у дабрачыннай акцыі, некаторыя адразу пытаюцца: «А вызваленне ад пар будзе?» Такіх адразу адпраўляем на заняткі.

Самае складанае, на думку дзяўчыны, перадолець псіхалагічны бар'ер. Перад першым візітам у інтэрнат у навічкоў узнікае шмат пытанняў, у тым ліку і пра тое, як правільна размаўляць з дзецьмі?

— Галоўныя якасці для валанцёра — адкрытасць, гатоўнасць заўсёды прыйсці на дапамогу, уменне пасунуць свае жаданні на задні план, — лічыць кіраўнік атрада. — Калі ты дапамагаеш іншым, то і сам атрымліваеш зарад пазітыўных эмоцый. А для будучых педагогаў карысны таксама і вопыт работы з дзецьмі розных узростаў.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

Не вучобай адзінай

# МЕДЫЯГОЛАС СТУДЭНЦТВА

**У Белдзяржуніверсітэце падвялі вынікі першага конкурсу на лепшы медыйны рэсурс. У намінацыі «Найлепшы Instagram-акаўнт» перамог механіка-матэматычны факультэт, «Найлепшы Youtube-канал» — Студэнцкае тэлебачанне ВНУ, «Найлепшы блог» — Творчая студыя «Мім-БДУ».**

Перамогу ў намінацыі «Найлепшая суполка ў сацыяльнай сетцы "УКантакце"» падзялілі Студэнцкі савет па якасці адукацыі і суполка філалагічнага факультэта. «Найлепшай студэнцкай газетай» стала перыядычнае выданне хімічнага факультэта «Chemical Boom», а спецыяльным дыпломам за цікавае асвятленне жыцця факультэта была адзначана газета гістарычнага факультэта «НІКА».

У намінацыі "Найлепшая медыйная прастора БДУ" лідары вызначаліся ў паднамінацыях «Факультэт» і «Маладзёжная арганізацыя». Так, у першай пераможцам стаў Ліцэй БДУ. На другім і трэцім месцах размясціліся механіка-матэматычны і філалагічны факультэты адпаведна. У другой — перамагла медыйная прастора пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў БДУ.

Нагадаем, што ўсяго ў спаборніцтвах сярод медыйных рэсурсаў БДУ прынялі ўдзел 40 рэдакцыйных калектываў факультэтаў, грамадскіх арганізацый і органаў студэнцкага самакіравання, а таксама адміністратараў інтэрнэт-рэсурсаў. Арганізатарамі конкурсу выступілі ўпраўленне выхаваўчай работы з моладдзю і Медыяцэнтр БДУ.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

# ЗЛАВІЦЬ ХВАЛЮ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Да нас прыходзяць з васьмі гадоў, — расказвае **трэнер-выкладчык і сяміразовая абсалютная чэмпіёнка свету Ганна ШЭВЯЛЕНКА.** — Спачатку развучваем азбуку Морзэ: на гэта ў дзяцей ідзе два месяцы. Потым яны самастойна трэніруюцца. Адны працуюць за электроннымі ключамі (спецыяльнымі прыборамі) і перадаюць тэкст. Іншыя прымаюць «пасланні», якія ім выдае камп'ютар. Каб паспяваць запісваць, кожны трэнер прапануе сваю сістэму замен — «сакрэтны код». Замест літар і лічбаў ставім кручкі і палачкі. Так мы можам запісаць ад трох да пяці знакаў у секунду.

На спаборніцтвах на заданне даецца адна хвіліна. Хуткасць спартсмен выбірае сам — як штангіст вагу, якую зможа падняць. «Трэба ўзяць той варыянт, дзе, як табе здаецца, будзе меней промахаў і, адпаведна, болей ачкоў. Калі допусціш больш за пяць памылак, работу не залічаць», — тлумачыць Ганна.

Ёй самой належаць тры сусветныя рэкорды. Апошні быў устаноўлены ў 2016 годзе: тады Ганна змагла прыняць літарны тэкст з хуткасцю 300 знакаў у хвіліну! Цікавімся, як дзяўчына трапіла ў гэты спорт.

— У школу прыйшоў трэнер і спытаў, хто з нас кемлівы, уседлівы і мае добрыя вынікі ў матэматыцы. Я запісалася ў секцыю, хоць тады нават не ўяўляла, што такое хуткасная радыётэлеграфія, — прыгадвае чэмпіёнка. — Знайшла новых сяброў, а потым уцягнулася ў спорт. Хацелася быць першай.

Каб дасягнуць поспехаў у гэтай дысцыпліне, у дзіцяці павінен быць добры слых. Як правіла, малых «пераманьваюць» з музычных школ і класаў харэаграфіі. Дзевяцігадовы Стас Чысцякоў якраз з такіх: раней ён вучыўся іграць на гітары. А потым з мамай трапіў на выставу тэхнічных відаў спорту, дзе і пазнаёміўся з новым для сябе кірункам. Цяпер чаргуе трэніроўкі па скачках у ваду з заняткамі па хуткаснай радыётэлеграфіі.

«Я запісваю 70 знакаў у хвіліну. Трэнер кажа, што гэта добрая хуткасць. Для мяне пакуль цяжка прымаць набор лічбаў, літар і знакаў прыпынку», — дзеліцца хлопчык. Стас ужо паспеў паўдзельнічаць у спаборніцтвах. З заданнем справіўся, праўда, так перахваляваўся, што не змог правільна перапісаць адказы ў бланк.

Займальная ў тых, хто займаецца хуткаснай радыётэлеграфіяй, добрая паспяховасць у школе і выдатная памяць.

— Гэты спорт трэніруе мозг. У Еўропе яго нават практыкуюць для рэабілітацыі дзяцей з ДЦП — так малыя развіваюць слых і дробную маторыку, вучацца канцэнтрацыі, нягледзячы і кароткачасовай, — кажа Ганна Шэвяленка. — Таму, калі дзіця няўседлівае, гіперактыўнае, прыводзьце яго да нас, мы гатовы папрацаваць.

11-гадовая Аня Ільюкевіч прыйшла ў радыёспорт пасля расказаў сяброўкі, якая тут даўно займаецца. «Усе дзеці пытаюцца: што ў гэтым цікавага? А мне падабаецца дадаваць пра штосьці новае». Любімыя Аніны прадметы ў школе — матэматыка і руская літаратура. А сярэдні бал дзяўчынкі — 9,2. Асвоіць азбуку Морзэ ёй было нескладана. А вось «сакрэтны код» вучыць давялося двойчы: школьніца займалася ў розных трэнераў, а ў кожнага з іх свая сістэма замен.

Што ў радыёспорце самае складанае? Прымусіць сябе пры мностве спакус сучаснага свету не сядзець у тэлефоне ці камп'ютары, а прыходзіць на трэніроўкі, лічыць Ганна Шэвяленка. Тыя, хто выйграе на спаборніцтвах, займаюцца пяць разоў на тыдзень. Дарэчы, за перамогу дзецям выплачваюць прызавыя. Сумы невялікія, 10—20 рублёў, але для школьніка гэта добры стымул імкнуцца да лепшых вынікаў.

## «Паляўнічыя» з прыёмнікамі

У суседнім класе дзеці «палююць на ліс». Не, ніякіх драпежнікаў у школе няма — «лісамі» называюцца радыёперадатчыкі (бо іх, як і гэтых жывёл, складана знайсці). Малыя шукаюць іх з дапамогай спецыяльнага прыёмніка з антэнай. А сама дысцыпліна называецца «спартыўная радыёпеленгацыя».

Спаборніцтвы звычайна праводзяцца ў лясах. Кожнаму ўдзельніку выдаецца карта мясцовасці, компас і адводзіцца 120 хвілін, каб вылічыць усіх «ліс». Мужчынам трэба знайсці пяць перадатчыкаў, жанчынам — чатыры, дзецям — два-тры. Дыстанцыя — ад трох да дзесяці кіламетраў у залежнасці ад узросту і полу.

— Спярша трэба праслухаць усіх «ліс», — уводзіць у курс справы **трэнер-выкладчык Людміла ЛАПА.** — А потым шукаць іх у правільным парадку — пачынаць ад той, што далей ад фінішу, каб не губляць час і не вяртацца па яе, пасля таго як сабраў астатнія. Пазыўныя, якія выдаюць перадатчыкі, адрозніваюцца апошнімі лічбамі, што дапамагае не заблытацца.

Прыёмнік ловіць сігнал у радыусе 90 градусаў. Чым гучнейшы гук у навушніках, тым бліжэй «ліса». Перадатчык працуе адну хвіліну, потым на чатыры замаўкае. Не паспееш засекчы адразу — згубіш пяць хвілін. Для спаборніцтваў гэта шмат.

З вясны да восені дзеці займаюцца на вуліцы — у парку ці лесе. А пакуль холадна, развучваюць у класе ўмоўныя абазначэнні на карце і трэніруюць слых — шукаюць перадатчыкі з закрытымі вачыма. Самым малодшым «паляўнічым» — 10 гадоў.

Складаней за ўсё знайсці «лісу», калі побач чыгунка ці аўтастрада, бо гэта перашкаджае лавіць сігнал. У гарах — а міжнародныя спаборніцтвы часам праводзяць менавіта на такой мясцовасці — таксама няпроста. Слухаеш пазыўныя — здаецца, што перадатчык знаходзіцца на вяршыні. Толькі дабег туды, сігнал вядзе ўніз.

Людміла Іванаўна, дарэчы, самы старэйшы «паляўнічы» краіны. Яна стала першым майстрам спорту СССР сярод жанчын па спартыўнай радыёпеленгацыі і абсалютнай чэмпіёнкай БССР.

— Я пачала бегаць з 1961 года, — успамінае Людміла Іванаўна. — У наш час гэты від спорту быў папулярны. Выйграць чэмпіянат Саюза было складаней, чым цяперашні чэмпіянат свету. На дыстанцыі бегла па 50 жанчын. Стаіш на старце — і такое напружанне, што ўсё дрыжыць. Калі ў канцы 1970-х гадоў мы набіралі ў спартыўную школу вучняў, вельмі шмат дзяцей запісвалася. Трэнераў столькі не было, каб усіх ахапіць.



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Трэнер-выкладчык Людміла Лапа паказвае, як працуе прыёмнік для пошуку «ліс».

## Кар'ера трэнера і сувязіста

Сёння ў дзіцяча-юнацкай школе радыёспортам займаюцца 225 дзяцей і юнакоў з дзяўчатамі. З іх 165 у Мінску, астатнія — у філіялах у Магілёве і Валожыне. Рабіць гэта можна да 22 гадоў. Асвойваюць радыёспорт таксама ў секцыях пры структурах ДТСААФ у Брэсце і Светлагорску.

— Летась 20 нашых выхаванцаў удзельнічалі ў міжнародных спаборніцтвах, 14 з іх занялі прызавыя месцы, — расказвае **дырэктар школы Ірына КАВАЛЕЎСКАЯ.** — І ў хуткаснай радыётэлеграфіі, і ў спартыўнай радыёпеленгацыі ёсць чатыры віды практыкаванняў. Па кожным — асобны залік. Таму спартсмен, паехаўшы на спаборніцтвы, мае шанц стаць адразу чатырохразовым чэмпіёнам свету.

Ці можа захапленне радыёспортам перарасці ў прафесію? Выпускнікі школы часта застаюцца ў ёй працаваць трэнерамі. Некаторыя служаць у арміі сувязістамі — цікава, што гэты шлях выбіраюць пераважна дзяўчаты. Веды ў галіне радыёсувязі могуць таксама спатрэбіцца ў экспедыцыях.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

Ідэі маладых

# КРЫНІЦА БЯСКОНЦАЙ ЭНЕРГІІ,

## АБО КАЛІ ЎСЁ — У НАШЫХ РУКАХ





**Міхаілу ВАГУ зараз 20 гадоў, ён заканчвае Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт. Хлопец ужо які год працуе над сваім праектам пад назвай HardEnergy. Што гэта такое? Ні многа ні мала ён прыдумаў крыніцу... бясконцай энергіі.**

— Яшчэ калі я вучыўся ў гімназіі ў Гомелі, займаўся ў мясцовым Палацы творчасці дзяцей і моладзі, — кажа суразмоўца. — Распрацоўваў гульні і праграмы рознага кшталту, удзельнічаў з імі ў конкурсах і часта выйграваў. Трапіў у Банк таленавітай моладзі. Што гэта былі за праекты? Самы цікавы — праграма па навучанні дзяцей англійскай мове ў гульнявой форме.

Для вучня старшых класаў тая работа была выканана на вельмі высокім узроўні, таму не ўсе члены журы паверылі ў тое, што Міхаіл самастойна яе рэалізаваў. Аднак калі яны пачалі задаваць канкрэтныя пытанні, сумненні адпалі.

Цяперашні праект студэнта HardEnergy ўяўляе сабой прыладу для зарадкі розных дэвайсаў без падключэння да электрасеткі. «Як з'явілася ідэя? Калі, як і ўсе, пачаў сутыкацца з праблемай сілкавання мабільнага тэлефона. Яшчэ некалькі гадоў таму я пачынаў займацца бізнесам і зразумеў: самы лепшы варыянт — калі ты вырабляеш і прадаеш. Названая праблема аказалася глабальнай, бо тэлефоны ёсць ва ўсіх, таму я паспрабаваў яе вырашыць», — успамінае Міхаіл.

Вынаходніцтва ўяўляе сабой шар, які лёгка змяшчаецца ў руцэ. «Я вывучаў розныя рухавікі і зразумеў, што для назапашвання энергіі трэба нешта кампактнае, таму звярнуўся да трэнажораў. Выбар выпаў на powerball — кісцевы трэнажор, які быў створаны яшчэ ў 1980-я гады на аснове гіраскопа. Пры дасканалым вывучэнні зразумеў, што калі мадэрнізаваць механізм кручэння, то з гэтага можа нешта атрымацца», — кажа хлопец.

Унутры шара знаходзіцца металічны ротар, які круціцца з хуткасцю да 5000 абаротаў у хвіліну. Па сутнасці, гэта рухавік, які выпрацоўвае энергію, калі чалавек круціць у руцэ шар. Энергія назапашваецца ўнутры прылады, а можа і адразу перадавацца на тэлефон, калі ён падключаны праз USB-выхад. Па сутнасці, гэта гібрыд трэнажора і партатыўнай зараднай прылады. Ток у прыладзе такі ж, як і ў разетцы. Іншымі словамі, калі адначасова падключыць два тэлефоны — але адзін ад разеткі, а другі ад вынаходніцтва нашага суразмоўцы, — то зараджацца яны будуць з аднолькавай хуткасцю.

Вядома, аналагі такой прылады ёсць, пацвярджае Міхаіл. «Але няхай хто-небудзь гэта зробіць. Ідэя — толькі адна сотая працэнта ўсяго праекта, а 99 працэнтаў — рэалізацыя», — падкрэслівае студэнт.

Міхаіл расказаў, што, акрамя працы сем дзён у тыдзень, на праект былі неабходныя грошы. З гэтай мэтай ён вырашыў звярнуцца да краўдфандынгавых пляцовак.

— Лічба сабраных сродкаў пастаянна расце, цяпер яна складае крыху больш за 120 тысяч долараў, — кажа хлопец. — Але прынцып пляцовак такі: людзі, якія пералі нам грошы, павінны атрымаць прадукт. Таму нам прыйдзецца адправіць 1,5—2 тысячы асобнікаў прылады.

Цяпер каманда праекта, у якой налічваецца каля 10 чалавек у штаце, працуе над вытворчасцю. «Мы плануем, што ўсе дэталі будуць прыходзіць з розных месцаў, а зборка адбывацца ў нас, — дадае Міхаіл. — Магчыма, калі пачнём продажы, памяняецца і механізм».

У каманды праекта няма ідэй, як развіваць прыладу. Як варыянт — працаваць у сферы экалагічных дэвайсаў-генератараў і пашырыць лінейку. Дарэчы, акрамя зараднага ўстройства прылада можа быць джойсцікам: калі круціць шар хутка, то машына ў гульні едзе хутчэй — і наадварот. Таксама гэта ўсё яшчэ трэнажор — можна выбраць мышцы, якія чалавек хоча патрэніраваць, і спецыяльная праграма на тэлефоне пакажа рухі, якія трэба рабіць з шарам.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**
*lukashevich@zviazda.by*

У ліку найлепшых

# Якая яна, «Мара навасельца»,

## ці Хто хоча электраскарбонку?

**Абласны этап рэспубліканскага конкурсу «100 ідэй для Беларусі» адбыўся ў чарговым па ліку рэгіёне — на Брэстчыне. Яго ўдзельнікамі сталі 50 найлепшых праектаў з розных раёнаў вобласці. Яны былі прэзентаваны на выставе, якая прайшла ў Брэсцкім навукова-тэхналагічным парку.**

З агульнай колькасці палова праектаў была прадстаўлена ў намінацыі «Сацыяльная сфера». Маладзёжны лагер міжкультурных камунікацый «Скрыжаванне ля Буга» прыдумалі педагогі Дамачаўскай сярэдняй школы — настаўнік гісторыі і выяўленчага мастацтва Кірыл Гаўрыленка і намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце Таццяна Сіняўская. Тут жа быў выстаўлены шэраг праектаў дабрачыннай накіраванасці і праектаў па стварэнні музеяў — віртуальных і рэальных.

Праекты «Электраскарбонка» і «Лазерны гравёр» прадставіў на выставе Алег Сай, вучань 9-га класа СШ № 4 г. Брэста. Электраскарбонка здольная лічыць манеты з дапамогай самаробнага датчыка, які будзе распазнаваць іх па меры яго закрыцця манеткай. Такая электраскарбонка здольная падлічваць выручку з аўтаматаў.

У сферы энергетыкі і энергаэфектыўнасці былі прэзентаваны праекты: «Энергія вентыляцыйных шахтаў ацяпляльных катлоў» (аўтар Іван Цымбаліст, вучань 10-га класа СШ № 3 г. Століна), «Мадэрнізацыя кіравання асвятлення ва ўмывальных інтэрната» (аўтар Яўген Дабралінскі, навучэнец першага курса спецыяльнасці «мантаж і эксплуатацыя электраабсталявання» Белаазерскага прафесійна-тэхнічнага каледжа), «Зарадное ўстройства для мабільнага тэлефона на сонечных батарэях» (аўтар Аляксандр Манцэвіч, вучань 9-га класа Новапалінскай СШ Драгічынскага раёна).

«Мара навасельца (МН-3)» — гэты праект Мікалая Лукашэвіча, навучэнца трэцяга курса спецыяльнасці «электраманцёр па рамонце і абслугоўванні электраабсталявання, зваршчык ручной зваркі» Лунінецкага дзяржаўнага політэхнічнага прафесійна-тэхнічнага каледжа, быў прадстаўлены ў намінацыі «Бяспека жыццядзейнасці і абараназдольнасці». Прыбор дазваляе выявіць не толькі месцы наяўнасці адкрытай праводкі, але і месцы пашкоджанняў, абрыву токаводных жыл правадоў і кабеляў.

Праект «QFix — сістэма для абслугоўвання аўтамабіляў» быў падрыхтаваны групай студэнтаў Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта — Сяргеем Млынчыкам, Віктарам Ляневічам, Яўгенам Кузьмічом, Яраславам Ліпскім. Яго задача — аўтаматызаваць працэс узаемадзеяння аўтасэрвісаў і аўтаўладальнікаў.

Найлепшыя праекты будуць прадстаўляць Брэстчыну на рэспубліканскай выставе «100 ідэй для Беларусі». А ўвогуле ўсе яны пасля дапрацоўкі з улікам заўваг увойдуць у банк маладзёжных ідэй, які будзе размешчаны на інтэрнэт-рэсурсах абласной арганізацыі БРСМ, а таксама прэзентаваны ўсім зацікаўленым у сферы адукацыі, медыцыны, сектара эканомікі і прыватнага бізнесу.

Як плануецца, да канца месяца аналагічная абласная выстава рэспубліканскага конкурсу «100 ідэй для Беларусі» пройдуць таксама на Гомельшчыне і Міншчыне.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# «Следчым вырашыў быць з дзяцінства»

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)**

— Яшчэ адна справа — крадзеж у буйным памеры. Двое пацярпелых вярталіся з Расіі. Хацелі там купіць машыну — адзін другому прапанаваў свае паслугі ў пошуку. Машыну не выбралі, прыехалі ў Баранавічы, пакінулі грошы ў аўтамабілі, дзверы не зачынілі і сышлі. Як вынік — знікненне дзевяці тысяч долараў. Сталі высвятляць звесткі пра асобы пацярпелых. Адзін з іх быў асуджаны за забойства на 12 гадоў, выйшаў пару месяцаў таму. Але ён сцвярджаў, што з гэтай жа машыны таксама прапалі і яго 600 долараў. Канфіскавалі мабільны тэлефон, цалкам разбіты, адправілі на экспертызу. Высветлілася, што ў апараце мелася функцыя аўтазапісу тэлефонных размоў.



З калегамі можна параіцца заўсёды.



Следчы спяшаецца на выезд.

Па іх стала зразумела, што пацярпелы — зусім і не пацярпелы. Са сваімі саўдзельнікамі ён дамаўляўся, што выйдзе з машыны, а дзверы не зачыніць, — прыгадаў суразмоўца.

У вольны час Ігар разам з маладой жонкай займаецца спортам.

— Сам я даўно, яшчэ са школы, захапіўся валейболам, цяпер гуляю ў камандзе Следчага камітэта па Брэсцкай вобласці. Канешне, вольнага часу няшмат, але стараемся ў выхадныя дні і плаваць, і ў спартзалу хадзіць. Час ад часу — у кіно, да бацькоў у госці заязджаем. З будучай жонкай пазнаёміўся, калі ўжо стаў працаваць у Следчым камітэце. Дарэчы, гэта вельмі важна. Ведаю, іншым не надта падабаецца, калі муж пастаянна на рабоце, затрымліваецца. А мая ведала, на што ішла, і што праца ў мяне няпростая, — канстатуе Ігар.

**Парык, акуляры на палову твару, някідкае адзенне, крама... Устанавіць злачынцаў-кішэннікаў у такім выпадку вельмі складана. Але ўдалося.**

— Быць следчым — гэта...

— Хутка мысліць, прытрымлівацца прафесійных прынцыпаў, быць стрэсаўстойлівым, умець прымаць аргументаваныя рашэнні і браць на сябе адказнасць. Таму што менавіта следчы вырашае, ці будзе хадзіць чалавек пад падпіскай аб нявыездзе або будзе ўзяты пад варту...

**Марына БЕГУНКОВА,**
**фота аўтара.**
*begunkova@zviazda.by*
*Мінск — Баранавічы — Мінск.*

*Свая атмасфера*

# ГУЛЬНЯ ІНТЭЛЕКТУ, ці Тры галоўныя пытанні для знаўцаў

**У кастрычніку 1996 года Беларуская ліга інтэлектуальных камандаў вырашыла правесці першы чэмпіянат Мінскай вобласці па інтэлектуальных гульнях. Гэты на першы погляд звычайны факт не перавярнуў увесь свет, але пакінуў значны адбітак у гісторыі Чэрвеньшчыны. Бо з таго моманту тут пачалося стварэнне інтэлектуальнага клуба «Ігумен» (даўнейшая назва горада), які існуе ўжо больш за дваццаць гадоў, напоўненых яскравымі і цікавымі падзеямі.**

Тады сабраць каманду прапанавалі метадысту Дома дзіцячай творчасці Ірыне Вабішчэвіч (цяпер — старшы навуковы супрацоўнік Чэрвеньскага раённага краязнаўчага музея). «Якую каманду? Для чаго? Я чамусьці была ўпэўнена, што ў «Што? Дзе? Калі?» гуляюць толькі па тэлевізары», — успамінае яна. Сабралі ўдзельнікаў алімпіяд з трох школ. Пачалі трэніравацца на пытаннях вікторыннага тыпу. У асноўнай гульні каманда заняла трынаццатае месца, але перамагла ў брэйн-рынгу. Дзякуючы гэтаму інтэлектуалы-пачаткоўцы атрымалі шанц удзельнічаць у чэмпіянаце Беларусі ў Магілёве. «Мне там так спадабалася! Зусім іншы тып людзей, свая атмасфера... Я вырашыла: нам жыццёва неабходна арганізаваць свой клуб!» — кажа Ірына, якая пазней стала кіраўніком «Ігумена», трэнерам, арганізатарам і вядучай інтэлектуальных гульняў у Чэрвені.

І пачалося! Дзеці прыводзілі сваіх сваякоў, сяброў, знаёмых. Стваралiся новыя каманды. Многа-многа камандаў. На трэніроўкі ўсе прыходзілі з задавальненнем. Але пытанні для іх было знайсці цяжка. Ірына Вабішчэвіч працягвае ўспамінаць: «Камп'ютараў не было, адпаведна, ніякай электроннай пошты, сацыяльных сетак. Спачатку пытанні перапісвалі ці перадрукоўвалі ў іншых камандаў, з якімі завязаліся стасункі з самага першага турніру. Потым, калі ў Доме дзіцячай творчасці з'явіўся першы камп'ютар, я прынесла дыскету... Гэта было такое шчасце!» Гульцы складалі пытанні самі, развіваючы ўласныя ўменні і талент. Пазней пачалі далучацца і каманды дарослых...



**Інтэлектуальны клуб — гэта не проста «гурток па інтарэсах», а вялікая і дружная сям'я.**

Мноства турніраў было прыдумана і праводзіцца дагэтуль. У студзені — традыцыйны «Тацянін дзень», падчас яго таксама адзначаюць і дзень студэнта. У гульнях бяруць удзел будучыя студэнты (школьнікі), самі студэнты і былыя студэнты (дарослыя). У лютым — самы буйны і адметны турнір — фестываль «Ігуменская завея». На яго з'язджаюцца каманды не толькі з раёна, але і з вобласці, рэспублікі.

— Гэты турнір такі маштабны, таму што мы яго добра піярым. Год ад году ён становіцца ўсё больш папулярны. Наш рэгіянальны прадстаўнік Вадзім Кузьміч прыдумаў Кубак Мінскай вобласці, які можна атрымаць, абавязкова ўдзельнічаючы ў пэўных турнірах, сярод якіх і «Ігуменская завея». Адпаведна, наймацнейшыя каманды вобласці зацікаўлены ў тым, каб удзельнічаць у нашым турніры. Да таго ж вядзе гульні Леанід Клімовіч (вядомы і знакаміты сярод знаўцаў складальнік пытанняў, гулец «Што? Дзе? Калі?» і тэлевядучы. — **Аўт.**). Мы знаёмыя з ім даволі даўно, нават вучыліся ў адным універсітэце. Таму я запрасіла яго ўжо на трэцюю «Завею», — расказвае Ірына.

Шмат гадоў «Ігуменская завея» лічыцца міжнароднай: на турнір прыязджае каманда з расійскага горада-пабрацiма Каралёў. Спачатку расіянам было цяжка прызвычаіцца да пытанняў, бо яны часта былі звязаныя з падзеямі ў Беларусі. Аднак апошнія два гады яны ўжо смела бяруць «ігуменскія» дыпломы. Вясной пабрацімы запрашаюць чэрвеньскіх эрудытаў да сябе, на інтэлектуальныя гульні, якія яшчэ развіваюцца і пакуль што істотна адрозніваюцца ад беларускіх, але ўжо набліжаюцца да звыклага нам «Што? Дзе? Калі?».

Сямейны турнір, у якім удзельнічаюць юныя інтэлектуалы і іх бацькі; сінхронны абласны турнір, на які з'язджаюцца гульцы з суседніх гарадоў — Беразіно і Мар'інай Горкі; турнір памяці Юрыя Міpановіча (капітана дарослай каманды «Вёска», які шмат зрабіў для развіцця клуба) — гэта тое, чым жывуць і што вельмі любяць знаўцы Чэрвеньшчыны.

Інтэлектуальныя гульні амаль заўсёды фінансуюцца аддзелам адукацыі Чэрвеньскага райвыканкама. Але знаходзяцца і спонсары. Сярод іх — індывідуальны прадпрымальнік Марыя Захаранка, Запольскі філіял прадпрыемства ТАА «Вітрум», дзякуючы якім каманды заўсёды маюць кубкі, дыпломы і іншыя прызы. Салодкімі напоямі забяспечвае «Чэрвеньскі вытворча-харчовы завод». Мясцовы лясгас дорыць свае прыгожыя туі. Ірына Вабішчэвіч успамінае: «Было вельмі здорава, калі гэтае дрэўца выйграла каманда з Мінска. Дзеці былі такія шчаслівыя!» Дапамагаюць і свае выхаванцы, якія выраслі і ўжо шмат чаго дасягнулі ў жыцці. Хтосьці купляе элементы апаратуры, якіх не стае, іншыя дапамагаюць грашыма...

— А ці не надакучыла вам за больш чым дваццаць гадоў гуляць у інтэлектуальныя гульні? — цікаўлюся ў Ірыны Вабішчэвіч.

— Я вельмі стамляюся і ў канцы года пастаянна думаю, што гэта ўсё, фініш, — кажа яна. — Але за лета паспяваю засумаваць па сваіх інтэлектуалах. Гульні для мяне сталі своеасаблівым наркотыкам. Для таго каб турніры не былі аднастайныя, кожны год мы прыдумваем штосьці новае. Напрыклад, тэматычныя «Што? Дзе? Калі?, прымеркаваныя да пэўнай падзеі ці даты. На адкрыцці турніру ў нас то Баба Яга выскачыць, то разам адзначаем Дзень святога Валянціна.

Інтэлектуальны клуб «Ігумен» — гэта не проста «гурток па інтарэсах», а вялікая і дружная сям'я. І гэтым яны адметныя. Існуюць жа іншыя клубы! Дваццаціпяцігадовая «Белая рысь» Леаніда Клімовіча, дваццацігадовы клуб у Лепелі... Але толькі ў Чэрвені, на думку кіраўніка «Ігумена», існуе непаўторная атмасфера сяброўства і неверагодны энтузіязм. А яшчэ — жаданне ведаць пра ўсё на свеце.

І калі жыццё — гэта гульня, то ў знаўцаў яна называецца «Што? Дзе? Калі?».

**Юлія АДАМОВІЧ,**
**студэнтка III курса**
**Інстытута журналістыкі БДУ.**

*Свет магіі*

# «ЗДЗІЎЛЯЦЬ ЛЮДЗЕЙ — ГЭТА ПРЫЕМНА»

**Кажуць, праграмісты ўмеюць ствараць цуды, напрыклад, адным націскам кнопкі могуць адрамантаваць камп'ютар. Будучага праграміста Мікіту Казельку дакладна можна назваць сапраўдным чараўніком: студэнт трэцяга курса БДУІР ужо больш за пяць гадоў захапляецца... фокусамі. Хлопец згадзіўся трохі прыадкрыць нам магічную заслону...**

***— Мікіта, з чаго пачалося тваё захапленне?***

— Аднойчы яшчэ сямікласнікам зайшоў да сябра, а ў яго на паліцы стаяла кніжка пра фокусы. Вядома, там былі самыя простыя трукі, падобныя на тыя, якія нам у дзяцінстве паказваюць бацькі, але мяне яны чымсьці зачапілі. Хоць мае першыя вопыты мала каго ўразілі, я працягваў займацца. Спачатку купляў кнігі пра фокусы ў найбліжэйшай краме, пазней стаў заказваць больш сур'ёзную літаратуру па інтэрнэце. У выніку я знайшоў аднадумцаў, з якімі можна было падзяліцца досведам і атрымаць новыя веды.

***— Дзе даводзілася выступаць?***

— На розных мерапрыемствах, у тым ліку ўдзельнічаў у конкурсах. Маё самае яркае ўражанне, звязанае з «магічнай практыкай», — другое месца на міжнароднай канферэнцыі фокуснікаў «Magic Grodno — 2014». Было прыемна атрымаць адабрэнне не толькі ад гледачоў, але і ад журы — прафесіяналаў, чые імёны гавораць самі за сябе.

**«Ёсць шмат добрых фокусаў, якія да гэтага часу застаюцца для мяне загадкай. І, шчыра кажучы, мне б не хацелася ведаць іх сакрэт».**

***— Напэўна, цябе часта просяць раскрыць сакрэт фокуса. Як не паддацца ўгаворам гледачоў і захаваць усё ў тайне?***

— Ёсць адзін добры прыём: спытаць у гледача, ці ўмее ён захоўваць тайны. І пасля таго як той дасць станоўчы адказ у надзеі, што зараз спазнае сакрэт, адказаць: «Я таксама ўмею іх захоўваць». Для фокусніка вельмі важна правільна павесці сябе ў такой сітуацыі.

***— А ці здаралася, што падчас выканання трук не атрымаўся?***

— Вядома, такое бывае. Нярэдка даводзіцца спецыяльна рабіць выгляд, што фокус не атрымаўся, тады глядач трохі расслабіцца і наступны трук уразіць яго значна больш. У любым выпадку пасля няўдачы трэба здзівіць гледача, каб ён застаўся задаволены. Бо лепш за ўсё запамінаюцца першы і апошні фокусы.

Дарэчы, часам сутыкаешся з тым, што твае трукі выкрываюць. Калі гэта робіць іншы фокуснік, то мне не крыўдна, нават прыемна, бо ён можа паказаць на тыя моманты, дзе варта яшчэ патрэніравацца. Але калі мяне спрабуе выкрыць глядач, я перапыняю яго і тлумачу, што ў гэтым няма неабходнасці: навошта забіваць магію?

***— Якімі якасцямі, на твой погляд, павінен валодаць сапраўдны фокуснік?***

— Думаю, у першую чаргу гэта нават не спрытнасць рук. Ты павінен умець размаўляць з гледачамі, быць харызматычным. Гэта дапаможа з поспехам выйсці з нечаканай сітуацыі і адцягнуць увагу ў патрэбны час.

Самае складанае для фокусніка — пастаянныя трэніроўкі. Нават калі здаецца, што фокус ужо вось-вось гатовы, не варта адразу дэманстраваць яго публіцы — лепш яшчэ парэпеціраваць, давесці ўсё да «бляску». Даводзіцца доўгі час эксперыментаваць, каб атрымаць жаданы эфект. Затое ў якасці ўзнагароды ты атрымліваеш шмат станоўчых эмоцый ад гледача. А здзіўляць людзей — вельмі прыемна.

***— Чым прыкладам ты натхняешся?***

— Калі браць рэальнага чалавека, то гэта ілюзіяніст Шын Лім. Ён валодае выдатнай тэхнікай і з'яўляецца наватарам у жанры мікрамагіі, у якім я часта працую сам. Калі ж гаварыць пра персанажа кіно, то мяне натхняе фокуснік Альфрэд Бордэн (акцёр Крысціян Бэйл. — **Заўв. рэд.**) з фільма «Прэстыж». Ён прыклад таго, як можна цалкам аддавацца сваёй справе.



***— Калі б прадставілася магчымасць спазнаць сакрэт любога трука, які б ты выбраў?***

— Хоць я далёка і не навічок, але ёсць шмат добрых фокусаў, якія да гэтага часу застаюцца для мяне загадкай. І, шчыра кажучы, мне б не хацелася ведаць іх сакрэт. Прыемна проста расслабіцца і атрымаць асалоду ад выступлення фокусніка. Так я магу адчуць сябе на месцы гледачоў.

***— Ці плануеш далей развівацца ў гэтай сферы?***

— Нядаўна мне прыйшлося зрабіць выбар, якое з двух захапленняў выводзіць на першы план. У выніку вырашыў больш сіл аддаваць праграмаванню, а фокусы пакінуць як хобі. Але цяпер, пасля двухгадовага зацішша, падчас якога я выступаў даволі рэдка, планую вярнуцца ў жанр мікрамагіі і працягваць развівацца. Мне, як і кожнаму чалавеку, хочацца верыць у чараўніцтва. А фокусы — гэта інструмент, які дапамагае дакрануцца да цуду.

**Ганна ЯЎСЕЙЧЫК,**
**студэнтка III курса Інстытута журналістыкі БДУ.**

## Информационное сообщение о проведении аукциона по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов в аг. Барсуки, дер. Калюжки Жодинского сельсовета Смолевичского района Минской области

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Форма проведения аукциона | Открытый |
| 2 | Дата, время и место проведения аукциона | **16 февраля 2018 года, в 10.00,** г. Жодино, пер. Молодежный, 3, Жодинский сельисполком, кабинет № 1 |
| 3 | Продавец и его адрес | Жодинский сельский исполнительный комитет, г. Жодино, пер. Молодежный, 3 |
| 4 | Земельный участок, его кадастровый номер и адрес | **Лот № 1** – земельный участок № 10 площадью 0,1490 га с кадастровым номером 624881701101000438 в аг. Барсуки;<br>**Лот № 2** – земельный участок № 2 площадью 0,1274 га с кадастровым номером 624881707601000248 в дер. Калюжки |
| 5 | Условия продажи | Без изменения целевого назначения |
| 6 | Целевое назначение земельного участка | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома |
| 7 | Начальная цена продажи | **Лот № 1** – 16 000,00 рублей;<br>**Лот № 2** – 9 000,00 рублей |
| 8 | Условия проведения аукциона | Участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь.<br>Аукцион считается состоявшимся при наличии не менее двух участников |
| 9 | Наличие инженерной инфраструктуры | Лот № 1 (электроснабжение, газоснабжение) |
| 10 | Сумма задатка и реквизиты продавца | 10 % от начальной цены земельного участка, р/с BY49AKBB36410616005746200000 в ЦБУ № 616 в филиале 612 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Жодино, ул. 50 лет Октября, 25«А», БИК AKBBBY21612, УНП 600023532 (с пометкой «Задаток за земельный аукцион») |
| 11 | Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемыми земельными участками | Каждую среду в 15.00 |
| 12 | Начало подачи заявлений | С 18 января 2018 года с 8.00 до 17.00 каб. № 4 |
| 13 | Окончательный срок приема заявлений | 13 февраля 2018 года до 17.00 |
| 14 | Контактные телефоны | 8 01775 35-449, 8 01775 37-174, 8 01775 37-189 |

Расходы по организации и проведению аукциона и затраты на публикацию информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона и составляют: земельный участок в аг. Барсуки – 1 528,47 рублей, земельный участок в дер. Калюжки – 1 628,38 рублей (без учета стоимости информационного сообщения).

**Примечания: для участия в аукционе на адрес продавца необходимо представить:**

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Копии платежных поручений, заверенные банком, подтверждающие внесение задатка на расчетный счет продавца.
3. Документ (копию), удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица.
4. Доверенность, заверенную нотариально (в случае, если на аукционе интересы покупателя представляет это лицо).

## Управляющий по делу о банкротстве ООО «ОптимаСнаб» – ИП Марук Л. А. объявляет о проведении первых торгов в форме открытого аукциона

**Лот № 1.** Дебиторская задолженность на сумму 41 889,82 руб.:

ООО «Белтехнопартс» на сумму 1518,00 руб.; ООО «АгроСервис-Стандарт» – 3180,04 руб.; КСУП «Гнездилово-Агро» – 2063,22 руб.; ОАО «Душево» – 7069,41 руб.; ОАО «Минский мясокомбинат» – 1394,44 руб.; ОАО «Париж-Агро» – 7521,01 руб.; ОАО «Прогресс 2010» – 19 143,70 руб.

Начальная цена предмета торгов – 41 889,82 руб.

Место, дата и время проведения торгов: г. Минск, ул. Скрыганова, 6, оф. 323а, **19.02.2018 в 12.00.**

Размер шага аукциона – 5 % от начальной цены предмета торгов. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Задаток в размере 10 % от начальной цены предмета торгов перечисляется на расчетный счет ООО «ОптимаСнаб», р/с BY54UNBS30121236600030000933 в ЗАО «БСБ БАНК» г. Минск, БИК UNBSBY2X, УНП 192012589. Задаток должен быть внесен до подачи заявки на участие в торгах.

Прием заявок на участие в торгах с приложением документов осуществляется посредством направления заказной корреспонденции в адрес организатора торгов – управляющего – ИП Марук Л. А. (220134, г. Минск, а/я 73) либо по e-mail: maruk-73@mail.ru до **17.00 17.02.2018.**

Документы, необходимые для участия в торгах: заявка на участие в аукционе, платежный документ о перечислении задатка; документ, подтверждающий полномочия на участие в торгах.

Затраты на организацию и проведение торгов возмещаются победителем торгов.

Справочная информация по тел.: 8 044 794-52-48, 8 017 204-04-94.

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения | Изолированное помещение, инв. № 422/D-28190 (назначение – торговое помещение, наименование – торговое помещение № 1), площадью 1487,4 кв. м, расположенное по адресу Щучинский р-н, г. п. Острино, ул. Гродненская, 7-1 |
| Земельный участок, на котором расположен объект | Кадастровый номер 425856600002000051, площадью 0,2531 га (назначение – для обслуживания здания магазина «Универмаг») по адресу Щучинский р-н, г. п. Острино, ул. Гродненская, 7. Земельный участок выделен под капитальное строение, оформление пользования земельным участком будет производиться в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь |
| Начальная цена продажи | 19 780 руб. (девятнадцать тысяч семьсот восемьдесят рублей) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 989 руб. (девятьсот восемьдесят девять рублей) |
| Продавец | Щучинский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231513, г. Щучин, ул. Пушкина, 26 |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 41-98-32 |
| Условия аукциона | Аукцион без условий |
| Условия оплаты | По договоренности сторон |
| Срок заключения договора купли-продажи | Не позднее 5 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/сч для перечисления задатка | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 31 января 2018 г. в 11.00 по адресу: г. Щучин, ул. Пушкина, 26**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;
*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.
При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются: представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя; физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица; представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.
В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.
**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 01.04.2017 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

*Последний день приема заявлений – 26 января 2018 г. до 15.00*
*Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32*
*http://grodnoino.by*

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении торгов в виде открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Унитарному транспортному предприятию «Могилевский автокомбинат» на праве хозяйственного ведения**

Лот № 1. **Капитальное строение с инв. № 700/С-322 – Здание автошколы,** расположенное по адресу: г. Могилев, пр-т Димитрова, 19Д, площадь 573,3 кв. м, назначение – здание специализированное для бытового обслуживания населения. Составные части и принадлежности: двухэтажное кирпичное здание автошколы с автодромом (бетонное покрытие, бух. инв. № 2000002, площадь – 1921 кв. м), забором (забор железобетонный, бух. инв. № 2000001, площадь – 82 кв. м), подпорной стенкой (бух. инв. № 2000003, площадь – 88 кв. м, материал –железобетон). **Капитальное строение с инв. № 700/С-672 – Здание заправочной,** расположенное по адресу: г. Могилев, пр-т Димитрова, 19Д/1, площадь 38,6 кв. м, назначение – здание нежилое. **Капитальное строение с инв. № 700/С-674 – Здание склада,** расположенное по адресу: г. Могилев, пр-т Димитрова, 19Д/2, площадь 45,5 кв. м, назначение – здание нежилое. **Капитальное строение с инв. № 700/С-91122 – Асфальтированная площадка,** расположенное по адресу: г. Могилев, пр-т Димитрова (Могилевский автокомбинат), площадь 912 кв. м, назначение – сооружение неустановленного назначения.
Сведения о земельном участке: объекты, входящие в состав лота № 1, расположены на земельном участке с кадастровым номером 740100000007000287 (право постоянного пользования), площадью – 0,7631 га, назначение: земельный участок для содержания и обслуживания зданий и сооружений. Отдельный земельный участок будет выделяться после продажи лота № 1.

***Начальная цена продажи: 129 711,00 бел. руб. с учетом НДС.***
***Сумма задатка 12 971,10 бел. руб.***

Лот № 2. **Капитальное строение с инв. № 700/С-91123 – Навес металлический,** расположенное по адресу: г. Могилев, пр-т Димитрова (на территории Могилевского автокомбината по пр-ту Димитрова, 3), площадь 153,0 кв. м, назначение – сооружение неустановленного назначения. Сведения о земельном участке: лот № 2 расположен на земельном участке с кадастровым номером 740100000007000287 (право постоянного пользования), площадью – 0,7631 га, назначение: земельный участок для содержания и обслуживания зданий и сооружений. Отдельный земельный участок будет выделяться после продажи лота № 2.

***Начальная цена продажи: 6 294,00 бел. руб. с учетом НДС.***
***Сумма задатка 629,40 бел. руб.***

| | |
|---|---|
| **Продавец** | Унитарное предприятие «Могилевский автокомбинат» УНП 700113374, Могилевская обл, г. Могилев, ул. Калужская, 17 |
| **Расчетный счет для перечисления задатка** | Получатель платежа РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **Аукцион проводится 21 февраля 2018 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, офис Могилевского филиала РУП «Институт недвижимости и оценки». Последний день подачи заявок и внесения задатка: 20 февраля 2018 года до 15.00 |
| **Срок и условия оплаты приобретенного с аукциона имущества** | В течение 5 (пяти) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона с победителем заключается договор купли-продажи. Оплата производится на условиях заключенного договора купли-продажи |

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юр. лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы, подавшие заявление на участие в аукционе (по форме, установленной Организатором аукциона); предоставившие заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, заявление об ознакомлении с документами, продаваемым Объектом (по форме, установленной Организатором аукциона) и заключившие с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (по форме, установленной Организатором аукциона), а также прилагаются следующие документы: юридические лица Республики Беларусь – копию свидетельства о гос. регистрации, копии учредительных документов, индивидуальные предприниматели Республики Беларусь – копию свидетельства о гос. регистрации; физ. лица – паспорт, представители физ. лиц и индивидуальных предпринимателей – паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально; иностранные юридические лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранные индивидуальные предприниматели – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представители иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованную в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.
Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Условие – наличие не менее 2 участников. Единственный участник имеет право приобрести объект по начальной цене, увеличенной на 5 %.
Участник, выигравший торги, возмещает затраты на организацию и проведение аукциона, в соответствии со счет-фактурой, которые подлежат уплате в течение 3 рабочих дней после проведения аукциона.

**Дополнительную информацию можно получить по тел: (8 0222) 72-41-14, 8 029 624-26-25, 8 044 738-18-99**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения | Капитальное строение, инв. № 400/С-28734 (назначение – здание специализированное розничной торговли, назначение – магазин), обшей площадью 235,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Кстинская, 18 |
| Земельный участок, на котором расположен объект | Кадастровый № 422080407101000085, площадью 0,0701 га (назначение – земельный участок для эксплуатации и обслуживания магазина), расположенном по адресу: г. Гродно, ул. Кстинская, 18 |
| Начальная цена продажи | 129 600 руб. (сто двадцать девять тысяч шестьсот рублей) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 12 960 руб. (двенадцать тысяч девятьсот шестьдесят рублей) |
| Условия аукциона | Аукцион без условий |
| Продавец | Гродненский филиал Гродненского областного потребительского общества, 230001, г. Гродно, ул. Суворова, 298, тел. 96-06-74 |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38 |
| Условия оплаты | По договоренности сторон |
| Срок заключения договора купли-продажи | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/с для перечисления задатка | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 19 февраля 2018 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;
*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.
При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются: представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя; физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица; представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.
В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница).**
**Последний день приема заявлений – 13 февраля 2018 г. до 15.00**

*Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»*
*http://grodnoino.by*

# ЗОРКА РАКХІГАРХІ

## *Урывак з аповесці*



*Алёна* **БЕЛАНОЖКА**

**У 2012 годзе «Маладосць» друкавала яе авантурную іранічную аповесць «Чамадан з кракадзілавай скуры». З таго часу чытачы пыталі, ці будзе працяг — так ім спадабаліся прыгоды Аліны. І вось ён, працяг. Тая самая Аліна гэтым разам мае справу з каштоўным каменем, які нейкім чынам спачатку трапіў да яе, пасля знік, пасля... «Любыя супадзенні з рэальнымі падзеямі і персанажамі — выпадковыя», — папярэджвае аўтар.**

АЛІНА ўвайшла ў хату, адсунула дзядулеў куфар, адкінула дзверцы склепа і наставіла на генерала пісталет.

Але знізу, са змроку, на Аліну з жахам паглядзеў не Шандар Сінгх, а звязаны Юрок з рушніком у роце.

— Ты што тут робіш, паскуднік? — абамлела Аліна. Юрок мыкнуў і закалаціўся ў паніцы.

— Ну што — «мы-ы-ы-ы»? — абурылася Аліна. — Зачыню цябе тут і з'еду дадому на паўгода, іператворышся ты ў мумію, і сточаць цябе мышы!

Юрок жаласна піскнуў ды заматляў галавой. Аліна спусцілася ў склеп і выняла з рота небаракі ручнік.

— Гавары! А то ў міліцыю пазваню. Чаго ты сюды ўсунуўся?

— Ну... па агурочкі...

— Па якія агурочкі, галава твая — гарбуз? Я тут бываю гады ў рады, страха хутка абваліцца — няма каму і калі рамантаваць, агарод лазняком парос, якія агурочкі?

— Салёныя... Думаў — у склепе ёсць...

Аліна схапіла Юрка за вуха і прыставіла да яго шыі пісталет:

— Дзе генерал?

— Такі вусаты?

— Вусаты-валасаты! Дзе?

— Не ведаю. Звязаў мяне і збег. Ударыў балюча! Па галаве! А я ж толькі па агурочкі... каб закусіць! Не страляй! Не забівай!

Аліна заткнула пісталет за пояс і развязала Юрка. Той дастаў з кішэні бутэльку гарэлкі. Бутэлька рассыпалася на аскепкі, — гарэлка пацякла Юрку на фуфайку.

Той заплакаў.

— Разбіў! Чорт вусаты. Разбіў маю бутэлечку! Ух, я яму! Па зубах дам! — замармытаў ён.

— А ну, давай адсюль, хутка! — Аліна схапіла Юрка за карак і пацягнула наверх, а выцягнуўшы, адвесіла добрага выспятка. — Пайшоў прэч! Нават блізка сюды не падыходзь! Агурок ты малахольны! Дзе мне зараз шукаць майго генерала? Яго ж тут ваўкі з'ядуць, будзе міжнародны скандал!

— Ты па слядах ідзі, — сказаў Юрок і шморгнуў носам. — Па снезе. Снег свежы.

— Зараз як дам! — замахнулася Аліна, але біць недарэку не стала. Яна выбегла на двор і ўбачыла ланцужок слядоў, што цягнуўся ад хаты праз поле ў бок Стараселля.

— Дык гэта ж тваё сляды! — крыкнула яна.

ў тым баку, адкуль даносіўся шум. Аліна вырашыла пад'ехаць бліжэй — і праз хвіліну спынілася акурат насупраць Немчыкавага жылля.

У двары каля дома разгарнулася дзіўнае відовішча: старасельскія мужыкі самкнуліся шчыльным колам, а ў цэнтры стаяў і раз'юшана размахваў паленам Шандар Сінгх.

Аліна выняла пісталет ды рынулася ў гушчу падзей — і, трэба сказаць, вельмі своечасова!

— А ну-тка, хлопцы, выпускай на яго Джокера! — крыкнуў Немчык.

Пара мужыкоў падбегла да клеткі, абсыпанай трэскамі. Пасярод яе горда сядзеў вялікі бабёр з разумнымі вачыма. Выпусціць яго мужыкі не паспелі.

— Усе назад! — закрычала Аліна і зрабіла папераджальны стрэл у неба.

Усе замерлі, павярнулі галовы да Аліны і адразу ж, без лішніх угавортванняў, адышліся назад.

— Не мае. Я агародамі ішоў, з Лапнікаў...

— Дзверы за сабой зачыні! Будзеш красці — у міліцыю здам! — пракрычала Аліна Юрку, скокнуўшы за руль, і націснула на газ. «Буцэфал» сарваўся з месца.

— Няма тут чаго ўжо і красці, — сумна прабубніў Юрок услед аўтамабілю і пацягнуўся дадому.

Пад'ехаўшы да Стараселля, Аліна спыніла аўтамабіль і моцна задумалася.

— Цікава, куды ён мог пайсці? ФАП зачынены, у інтэрнаце — канікулы, пуста... Проста да людзей? Засталося толькі чакаць...

Аліна заглушыла матор і прыслухалася. Да яе вушэй даляцелі крыкі, якія чаргаваліся з адборнымі мацюкамі. Нешта вельмі цікавае адбывалася

— Як ён тут апынуўся? — дзяўчына паказала ствалом на Сінгха, які таксама замёр — з паленам, ускінутым над галавою.

Мужыкі, на ўсялякі выпадак, маўчалі.

— Расказвайце, кажу, а то буду страляць! — крыкнула Аліна.

Наперад нерашуча выйшаў Немчык. Ён з недаверам паглядзеў на Аліну, на пісталет, які яна сціскала ў руках, і паведаміў:

— Гэты... Шындур, ці як яго... Прыйшоў, пагрукаў у акно... спытаўся пра нейкую Аліну, а ў нас ніякай Аліны і няма. Ну, бачу: у яго кроў на галаве. Давай, кажу, дапамагу табе! Самагонам рану яму прамыў, стопку наліў, закусіць даў — ён жа змерз увесь. Кажу: грэйся, адшукаем тваю Аліну. Ну — мужыкам пазваніў... Падцягнуліся. Генка вось — па-англійску трохі шпрэхае. Спыталіся ў яго, ці гуляе ён у карты... ну, тое-сёе... ён прайграўся. Кажу: бранзалет свой давай! А ён падскочыў, схапіў палена ды давай ім махаць. Ну, хлопцы — да яго, каб суняць. А тут якраз і ты. Твар нейкі ў цябе знаёмы... Ты не з Сякеркі будзеш?

— Я зараз як вазьму сякерку! — абурылася Аліна. — Міліцыі на вас няма!

— А што — усё чэсна... — сказаў Немчык.

— Я вам пакажу — чэсна! — Аліна махнула ствалом на двух мужыкоў, што стаялі з краю. — Вы двое! Звяжыце іншаземнага грамадзяніна.

— Чым? — спыталіся мужыкі.

— Вяроўкай, чым! Немчык, дзе вяроўка ў цябе?

— У хляве, — шчыра прызнаўся Немчык, хаця вяроўка была і не яго.

— Вазьміце вяроўку і звяжыце! А ты — не варушыся! — загадала Аліна Шандару. Той кінуў палена ў снег.



*Святлана* **КУРГАНАВА**

**Вучыцца ў Інстытуце журналістыкі БДУ і працуе рэдактарам у часопісе «Маладосць». Вядзе калонку «НеФармат» пра фантастыку і піша тое, што пішацца. Прыняла ўдзел у конкурсе маладых літаратараў «Першацвет» і ўвайшла ў лік фіналістаў.**

# ВАЎЧЫЦА

## *Урывак з апавядання*

Ужо даўно было цёмна, але Кан толькі прыйшоў з кузні. На лаве стаялі абкручаныя ручніком чыгуны з кашай і мясам. Было бачна, што абодва заварочвала Эва, — злева направа. Дачка заўсёды заварочвае ручнік справа налева.

Маленькая служка цяпер у хаце рабіла ўсё сама — як двухжыльная. Эва глядзела за гаспадаркай, выходжвала Канаву дачку і нават ірвалася дапамагаць самому Кану, але хто пацягне кволую драбязу ў кузню!

А почырк у Эвы быў роўны і чысты, быццам дзяўчынка адвучылася гадоў пяць у гарадской школе.

Эва з'явілася ў яго два гады таму. Знайшоў замораную дзяўчынку ў лесе напрыканцы лета.

Яна сядзела каля сцяжынкі, якая вяла ў іх вёску, і плакала. Ён бачыў яе ў суседнім селішчы — у старасты працавала за ежу, дапамагала рыхтаваць пасаг для дачок: вышывала, ткала, шыла. Пасля староста дачок выдаў замуж, дзяўчо стала непатрэбнае — і яго выкінулі на вуліцу. Эва пайшла не ў суседнюю вёску, а ў лес. І жыла ў лесе на працягу месяца ці крышачку больш. Цёткі хадзілі ў лес, бо шкадавалі, але да сябе не бралі: сваіх ратоў хапае.

Дзяўчынцы магло быць ад васьмі да чатырнаццаці. Сларбенькая, худзенькая, без пухлых дзіцячых шчок, з непрыгожа пазначанымі скуламі.

Той раз было туманна і мокра. Па лесе шнарылі цёткі — раней баяліся ў такое надвор'е ісці, але апошнім часам асмялелі. Казалі: у лесе ціха стала.

А Эва сядзела каля сцяжынкі і плакала.

— Пойдзеш да мяне служкай? У мяне на гаспадарцы толькі дачка засталася. Не спраўляецца, — ён сядзеў перад маленькай абарванай дзяўчынкай на кукішках і глядзеў на яе.

— Вы біць будзеце... балюча? — яна пыталася гэта сур'ёзна, гледзячы на яго падазрона і з кволай надзеяй.

...Падлеткі білі маленькае ваўчаня. Гэта ж яшчэ невялікі воўк: не страшна. Яго можна карміць, запрагаць у каляску і прымушаць цягнуць цяжкія бідоны з вадой. Потым можна даць трохі ежы, каб не здох, пасадзіць на ланцуг і весці паказваць дзяўчынкам. А потым можна паказаць, як ён — герой — забівае зласлівага ваўка. Няважна, што гэта яшчэ бяскрыўдная ваўчаня.

— ...Мядзяк у тыдзень, мая ежа і вопратка. Будзеш працаваць разам з дачкой — як дачка. Я ж яе — не б'ю.

Яна паднялася і працягнула руку:

— Эва.

Выхаваная. Зусім як яго Ханка.

— Буду тваёй жонкай, Кан. Больш няма куды падацца. Толькі ведай: руку на мяне не падымеш, — Ханка тады стаяла ганарлівая, хоць і з абгарэлай касой, адкінутай за спіну, каб не тузаць і не плакаць.

Ён тады яшчэ падумаў, што ўсе сваіх баб б'юць — і нічога. Але назваць яе, Ханку, бабай, той, што гатова цярпець, калі яе цягаюць прылюдна за касу...

— Пальцам не крану, — абяцаў ён. Ханка была прыгожая нават з абгарэлай у пажары касой, спраўная, з залатымі рукамі. Была — як прут, які гнецца, але не ламаецца. Кранеш з сілай — і табе ж самому па лбе прыляціць.

Зрэшты, і без гэтага ніколі не крануў бы, не абразіў: тое, што захапляе, аберагаюць, а не спрабуюць зламаць.

Дзяўчынка-заморак глядзела на яго сур'ёзнымі вялікімі вачыма.

— Кан, — ён акуратна пацiснуў велічэзнай лапай каваля маленькія дзіцячыя пальчыкі.



*Увага, конкурс!*

# ПРА СІНЯВОКУЮ — З КІТАЙСКІМ АКЦЭНТАМ

**Беларускае пасольства ў КНР і часопіс «Маладосць» абвясцілі конкурс эсэ, прысвечаных Беларусі.**

Арганізатары прапанавалі ўдзельнікам гэтага творчага спаборніцтва падзяліцца ў сваіх работах назіраннямі пра стэрэатыпы, якія ёсць у беларусаў адносна Кітая і, наадварот, у жыхароў Паднябеснай — пра Сінявокую. Канкурсантам трэба прыдумаць умоўную біяграфію — як быццам аўтар эсэ нарадзіўся ў Беларусі — і распавесці, як яму тут жывецца. Можна напісаць пра побыт жыхароў, можна пра наш клімат і г. д.

Да ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца цэнтры вывучэння беларускай культуры ў Кітаі, а таксама ўсе студэнты з гэтай краіны, якія вучацца ў Беларусі. Найлепшыя эсэ «Маладосць» надрукуе сёлета ў адным з нумароў, прысвечаных Паднябеснай.

Творчыя работы павінны быць аб'ёмам не больш за 7 тысяч знакаў. Дасылаць іх можна на беларускай, рускай ці кітайскай мовах да 31 сакавіка на электронныя адрасы: china@mfa.gov.by (з кітайскага боку), vdsd@tyt.by (у Беларусі) з абавязковай пазнакай «Конкурс эсэ аб Беларусі».

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
18 01 2018 г.

SEX-БАЛЯСЫ

# У ВОЧЫ ГЛЯДЗЕЦЬ!

**Ну што, шаноўныя?.. Добра яно або дрэнна, але зімовыя святы мы з вамі нарэшце ўсе адгулялі. Нават «кантрольны» стары Новы год. Усё, фініта ля камедыя, застаецца толькі чакаць наступных. Ці хіба крыху панастальгіраваць, як той казаў, наўздагон? Пакуль уражанні яшчэ свежыя... Але ў гэтым выпадку трэба быць гатовым не толькі прыгадваць, але і часам паглядзець праўдзе ў вочы ў прамым сэнсе слоў. А яны, як мы памятаем, люстэрка душы. Гатовыя? Хоць і спяваў некалі Юрый Антонаў пра тое, што «давай не бачыць дробнага ў люстраным адбітку», зрабіць гэта не заўсёды атрымліваецца. («У Новы год адбываюцца цуды! Напрыклад, можна паправіцца на пяць кілаграмаў за два дні».) Ну, ды не бярыце да галавы — гэта праблема хуткавырашальная пасля таго, як у халадзільніку заканчваюцца ўсе тазікі з аліўе. Ну, схадзіце, калі што, на трэніроўку навамоднага крос-фіта. Многія ж сябе менавіта гэтым і суцяшаюць, — што сходзяць, марачы імгненна пазбавіцца ад праблемы («З'явіліся тэлефоны, убудаваныя ў вуха, тэлевізары, убудаваныя ў вока... Вядуцца распрацоўкі новых унітазаў».) Але хопіць на кулінарную тэму. Каго ёй здзівіш? («Сакрэт пахудзення вельмі просты. Але сакрэт ёсць сакрэт».)**



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Напрыклад, студэнтка з Іркуцкай вобласці напярэдадні свят у прамым сэнсе слоў устала на абарону елак ад высечкі голымі грудзямі. Яна з'ездзіла ў зімовы лес, цалкам там распранулася паміж дрэвамі і ўпрыгожыла адно з іх. («Санта-Клаус заўсёды такі вясёлы, таму што ў яго ёсць спіс дрэнных дзяўчат».) Відэазапіс і фатаграфіі студэнтка, вядома, выклала ў свабодны доступ. І ведаеце што? Уважлівыя карыстальнікі захапіліся зусім не палымяным спічам дзяўчыны пра зберажэнне жывых лясных насаджэнняў... («Для ўсіх нельга быць пушыстым — расцягнуць на каўняры».) І нават не маладым аголеным целам на фоне зімовага лесу. («Парадокс. Калі поўная дурніца доўга сядзіць на дыеце, дык яна становіцца стройнай дурніцай, пры гэтым застаючыся такой жа поўнай...»). Яны звярнулі ўвагу найперш на тое, што ў кадры была толькі адна невялікая ўпрыгожаная ёлачка, а ўсе астатнія навокал — бярозы ды іншыя лісцевыя пароды. («Чаго толькі не робіць людзі, каб выканаць мару. Напрыклад, нічога».) Калі зірнуць праўдзе ў вочы, гэта ўжо не першая падобная акцыя дзяўчыны, калі яна аголенай і «пратэставала», і «падтрымлівала ў гонар». Дык, можа, бедная зялёная лясная прыгажуня тут і ні пры чым зусім? («Яны дзве гадзіны захоплена размаўлялі пра музыку, жывапіс, архітэктуру. Калі ён сказаў, што жанаты, гаварыць адразу не стала пра што».)

Перад святамі распрацоўшчыкі адной замежнай камп'ютарнай гульні, якая была запушчана ў тэставым рэжыме, мусілі прасіць прабачэння ў карыстальнікаў. Зноў жа самыя зоркія з іх (хоць там насамрэч толькі сляпы б не ўбачыў) разгледзелі, што ў намаляваных герань занадта рэалістычна праз бялізну знізу праступае самі здагадваецеся што... І на заклік грамадскасці «паглядзець у вочы» што адказалі распрацоўшчыкі? Ва ўсім вінаваты адзіны мастак-фрылансер, які вось так зразумеў сваю задачу! Вы паверылі, што гэта было ненаўмысна, а не дзеля раскруткі такім спосабам новай гульні? («Маці лгала маленькаму Андрушу, што дзяцей знаходзяць у капусце, і ён адмаўляўся есці галубцы».)

Ужо пасля святкаванняў па свеце пракаціўся жартаўлівы зімовы флэшмоб: пасажыры без штаноў праехалі ў метро ў як мінімум у 60 гарадах 25 краін. Ідэя заключалася ў тым, каб і сябе павесяліць, і іншых пацешыць, даць адпор зімовай апатыі і спячцы. («Калі я раблю глупствы, дык прыгадваю людзей, якія бяруць крэдыты на вяселлі, і мне становіцца лягчэй».) Ну, усё б яшчэ было нічога, каб гэты флэшмоб праходзіў першы ці другі раз. Напрыклад, на хвілiначку. («—Ты будзеш здзіўлены, але яна ў мяне першая, клянуся! — Пятровіч, мяне абсалютна не цікавіць твая першая група крыві!») Ну, нешта новае быццам бы... Шаснаццаты раз адбылася гэта акцыя! І што, слоган флэшмобу быў: без штаноў — цяпер і ў вашым горадзе?!. На гэтым фоне хіба толькі амерыканцам было б цікава зазірнуць у вочы. Я да таго, што менавіта ў час правядзення флэшмобу прыйшлі рэкордныя для многіх рэгіёнаў ЗША маразы — аж мінус дзесяць! («Паважаныя вытворцы зімовых куртак! Вы хоць разумееце, што ў вашай «зімовай» куртцы я мерзну ўжо ў лістападзе?!.») У нас жанчыны пры такім надвор'і ў танюткіх калготках працягваюць хадзіць і нічагусенькі... («Чужога нам не трэба, але сваё мы возьмем, чым бы яно не было».)

А вось сапраўдны святочны гісторыяй у тэму мне падаўся, на першы погляд, кур'ёз. У Ірландыі 74-гадовая жанчына ўпрыгожыла навагоднюю ёлку не шарамі, а ніжняй жаночай бялізнай ва ўпакоўцы ў выглядзе празрыстых шароў. А стрынгі ўнутры яшчэ і свяціліся. Уяўляеце? Пра гэты выпадак расказала ўнучка жанчыны. Карыстальнікі ў сецiве замілаваліся наіўнасці пенсіянеркі і параддзіліся, што шары з бліскучымі трусамі сапраўды можна было лёгка зблытаць з ёлачнымі цацкамі. («Папялушка ніколі не прасіла для сябе прынца. Яна прасіла выхадны і прыгожую сукенку».) А я вось што думаю... Калі б зірнуць у вочы гэтай дамы, ці не ўбачылі б мы ў іх яркія іскрынкі свавольства? Можа, не такая і сляпая насамрэч тая жанчына, якая здолела ўбачыць у свяце тое, чаго іншыя ўжо і не заўважаюць? («Дні нараджэння карысныя для здароўя. Брытанскія вучоныя даказалі, што тыя, у каго было больш дзён нараджэння, жылі, як правіла, болей».) А, як думаеце?..

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «Сям'я заўсёды — на першым месцы»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*



***— Гэта ж не першы конкурс прыгажосці для вас?***

— Калі была студэнткай, удзельнічала ў конкурсах прыгажосці на ўніверсітэцкім узроўні, адтуль накіроўвалі на рэспубліканскі. Быў і міжнародны «Каралева-вясна», які праходзіць у Мінску. У рэспубліканскім студэнцкім конкурсе «Student Star» я перамагла ў свой час. У «Каралеве-вясне» таксама ўвайшла ў фінал. Так што якісьці вопыт удзелу ў конкурсах я мела. Калі атрымала прапанову, адчула нават нейкую настальгію, падумала, чаму б і не? Паспрабаваць сябе ў новых абставінах — гэта добры шанц і новы досвед.

***— Нейкія абавязкі з'явіліся ў сувязі з атрыманнем тытула «Другой Віцэ-Місіс»?***

— Не, кантракт арганізатары падпісалі толькі з пераможцай. Але я лічу, што мой тытул — добрая нагода, каб самой зрабіць нешта для тых, каму патрэбна дапамога. Вось на Раство сумесна з арганізацыяй «SOS-Дзіцячыя вёскі» мы запрасілі больш за трыста дзяцей на кінапаказ мультфільма «Фердынанд». Стварылі ім святочны настрой.

***— Раскажыце пра ваш сацыяльны праект, з якім ехалі на конкурс?***

— Ужо сёмы год мы праводзім фестываль «Taste of Minsk». Гэта сямейнае мерапрыемства на адкрытым паветры, куды можна прыйсці і добра правесці час і дзецям, і дарослым. Для малых створаны розныя зоны, працуюць аніматары, ладзяцца конкурсы і спартыўныя спаборніцтвы. Кожны вечар праходзяць джазавыя вечары, працуе смачная кухня. Мінулым летам разам з ЮНІСЕФ мы вырашылі запрасіць сем'і бежанцаў з Украіны і Афганістана, якія жывуць у Беларусі, каб дапамагчы ім адаптавацца ў нашай краіне, пазнаёміць, каб дзеці знайшлі новых сяброў.

***— Арганізатар гэтага фестывалю, дарэчы, ваш муж — вядомы арганізатар свецкіх мерапрыемстваў, бізнесмен Юрый Рэут. Гэта ён вас натхняе на розныя праекты?***



— Канешне, ён з'яўляецца маёй апорай і падтрымкай, штосьці падказвае, і я вельмі ўдзячная яму за гэта. Але ў чым мы з мужам падобныя, дык гэта ў тым, што ў нас заўсёды былі актыўныя жыццёвыя пазіцыі. Заўсёды імкнёмся адзін аднаму дапамагаць і развівацца. Ён раіцца са мной наконт нейкіх новых ідэй, я — з ім. Атрымліваецца адзіная каманда. Праўда, ёсць напрамкі, дзе мы рухаемся асобна. Там я не ўмешваюся ў яго справы, а ён — у мае. Юра ў свой час атрымаў адукацыю праграміста, але кірункаў дзейнасці ў яго вельмі шмат, ён надзвычай заняты. Я бачу, што часу на сон у яго застаецца ўсё менш.

**«Мой тытул — добрая нагода, каб самой зрабіць нешта для тых, каму патрэбна дапамога».**

***— Раскажыце пра ваш праект «My Muse Vintage».***

— Ён дастаткова малады, з'явіўся два гады таму. Ідэя нарадзілася ў маёй сяброўкі, і мы кампаньёны ў гэтай справе. Сябруем даўно, разам вучыліся. Наша 27-я мінская школа была з тэатральным ухілам. Вось гэта мастацтва пераўвасаблення, любоў да касцюмаў на нас з Насцяй і паўплывала. Аднойчы ў Барселоне яна купіла некалькі вінтажных суkenак. Сяброўкі былі ў захапленні і прасілі панасіць. Так мы вырашылі, што камусьці яшчэ гэта будзе цікава. Аказалася, што вінтажным адзеннем захапілася шмат дзяўчат. Мы прывозім яго з Парыжа, Берліна, Барселоны, Мілана.

***— Ці ёсць зараз месца тэатру ў вашым жыцці?***

— Канешне, любоў да яго засталася. Цяпер разам з сынам хаджу на дзіцячыя пастаноўкі, каб захапіць яго гэтым відам мастацтва. Тэатр беларускай драматургіі (мой любімы), сучасны мастацкі тэатр і тэатр оперы і балета — вось так выглядае топ-3 маіх захапленняў.

***— Вы скончылі педагагічны ўніверсітэт, ці давялося працаваць па прафесіі?***

— Пасля школы я хацела быць актрысай, як і многія мае аднакласнікі ездзіла паступаць у Маскву, але не атрымалася. Каб не губляць год, пайшла ў педагагічны ўніверсітэт з думкамі пасля зноў паспрабаваць трапіць у тэатральны. Праўда, у ВНУ быў свой студэнцкі тэатр, я пачала там іграць, у мяне з'явіліся новыя сябры, і я вырашыла, што мне і тут добра. Я настаўнік мовы і літаратуры. У школе выкладаць давялося толькі падчас практыкі. Паколькі на апошніх курсах працавала ў адным з часопісаў пра моду і прыгажосць, то мяне размеркавалі ў гэтую рэдакцыю.

***— Зараз рэдагуеце часопіс Famous?***

— Так, яго выдае мой муж. А паколькі ў мяне ёсць вопыт такой працы, я займаюся творчай часткай.

***— Хапае часу на сям'ю?***

— Калі расстаўляць прыярытэты, то на першым месцы ў мяне заўсёды сям'я. У майго сына ніколі не было нянькі, першы год я адмовілася ад усіх праектаў і была толькі з ім. Увечары, у выхадныя адкладаю работу і больш часу праводжу з Маркам. Тата наш таксама стараецца перанесці свае справы, выбраць разам з намі на нейкае сумеснае сямейнае мерапрыемства.

**Алена КРАВЕЦ.** *kravets@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.008.
Нумар падпісаны ў 19.30 17.01.2018 г.

# ДОМ З НЯПРОСТЫМ ЛЁСАМ

## Што перашкаджае зрабіць музей з «аптэкі»?

